

ЦІ ТРЭБА КАРАЦЬ ДЗЯЦЕЙ?

Сямейная газета

ЯК ІНВАЛІДАЎ ВУЧАЦЬ НОВЫМ ПРАФЕСІЯМ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 ЛІСТАПАДА 2018 г. ЧАЦВЕР № 220 (28836)

Час капусту шаткаваць

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары Шаркаўшчынскага раёна ведаюць, да каго можна звярнуцца, каб прыдбаць адмысловы міні-камбайн для шаткавання капусты. Вядома, да майстра спраў драўляных — бондара і цесляра Валянціна ПІЦЬКО! Майстар жыве ў вёсцы Грыгараўшчына і па традыцыі кожную восень майструе гэты неабходны для кожнай сям'і рыштунак.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра:

«У нашай краіне створаны спрыяльныя ўмовы для інвеставання. Інвестар можа разлічваць на палітычную і сацыяльную стабільнасць, адсутнасць якіх-небудзь узрушэнняў. У сваю чаргу Беларусь разглядае замежныя інвестыцыі як дадатковую крыніцу фінансавых рэсурсаў краіны для абнаўлення і пашырэння асноўнага капіталу. Інвестыцыйнае заканадаўства рэспублікі пабудавана на сусветных прынцыпах, яно гарантуе ўсе правы інвестара, не падзяляе інвестараў на ўнутраных і знешніх, дапускае прымяненне брытанскага і любога іншага права і арбітражу».

КАРАТКА

- **Савет Міністраў Беларусі прызначыў паўнамоцным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у Савеце Еўразійскага банка развіцця міністра фінансаў Максіма Ермаловіча.**
- Развітанне з народным артыстам Беларусі і СССР Ігарам Лучанком прайшло 14 лістапада ў Цэнтральным Доме афіцэраў.

- **Беларусь і Расія завяршаюць работу над пагадненнем аб узаемным прызнанні віз.**
- Вытворчасць малака ў Беларусі перавышае ўнутраную патрэбнасць больш чым у два разы.
- **У Беларусі плануецца выпускаць для замежных інвестараў аблігацыі ў нацыянальнай валюце.**

Мясцовы час

НА ЧЫМ ВЕТКА ТРЫМАЕЦЦА

Формула поспеху мясцовага музея простая: шануй сваё, тым і будзеш цікавы

Сёлета Веткаўскі музей старажытнабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава адзначае 40-годдзе са дня заснавання. Гэта значны культурны і духоўны цэнтр не толькі Гомельшчыны, але і суседніх замежных рэгіёнаў — Браншчыны і Чарнігаўшчыны. Карэспандэнт «Звязды» даведалася, у чым феномен папулярнасці музея і як яго супрацоўнікам удаецца прыцягваць турыстаў з усяго свету. СТАР. 13

Жывіце ў бяспецы

АПАВЯШЧАЛЬНІКІ БЕЗ БАТАРЭЕК

...ДА ДАБРА НЕ ДАВЯДУЦЬ

Інтэрнаты заўсёды знаходзяцца пад асаблівай увагай ратавальнікаў. Калі выяўлена шмат парушэнняў, а прадпісанні сістэматычна не выконваюцца і ўсе меры ўздзеяння на адказных асоб вычарпаны, у рэйд запрашаюць журналістаў. Каб «герояў», якія ставяць пад пагрозу жыцці многіх людзей, ведала краіна. Між тым ёсць сумненні, што нешта зменіцца і пасля... СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

Час рэалізаваць дамоўленасці

Неабходна падняць статус аддзялення пасольства Швейцарыі да паўнавартаснага пасольства. Пра гэта гаварыў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, на сустрэчы з дэлегацыяй гэтай еўрапейскай краіны.

З моманту стварэння беларуска-швейцарскай парламенцкай групы дружбы прайшоў амаль год, і, на думку спікера, зроблена нямала. У прыватнасці, адноўлена работа беларуска-швейцарскага камітэта па гандлі і эканамічным супрацоўніцтве. Узаемны тавараабарот за мінулы год павялічыўся на 20 %, за восем месяцаў 2018-га — на столькі ж. Як адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў, Швейцарыя ўваходзіць у дзясятку краін, адкуль у нашу краіну прыходзіць найбольш інвестыцый. За мінулы год іх паступіла $50 мільёнаў, у тым ліку на чыстай аснове — $30 мільёнаў. Уладзімір Андрэйчанка, звярнуўшыся да Маргарэт Кінер Нелен, старшыні камітэта па фінансах Нацыянальнага савета Швейцарыі, запэўніў, што, калі ёсць нейкія перашкоды для прыходу інвестыцый, беларускі бок заўсёды гатовы пра іх пачуць.

Другое пытанне, як гаворыць спікер ніжняй палаты, гэта ўдзел Беларусі ў праграме SIPPO па падтрымцы імпарту. «Мы б хацелі праз гэту праграму ўвайсці з беларускімі таварамі на рынак Швейцарыі і Еўрапейскага саюза. Вы ўключылі ў гэту праграму, наколькі я ведаю, 11 дзяржаў», — адзначыў ён. Па папярэдняй дамоўленасці, калі гэты спіс будзе пераглядацца, Беларусь плануюць туды ўключыць. Наша краіна якраз мае тавары, якія рэалізуюцца праз гэту праграму: драўніна, ільняная тканіна, прадукты харчавання...

Таксама старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што нам неабходна наладжваць супрацоўніцтва паміж банкамі, і анансаваў візіт старшыні праўлення Нацыянальнага банка Паўла Калаура ў Швейцарыю на пачатку снежня.

Надзея АНІСОВІЧ.

Тры пытанні да ўлады

КРЫЧАЎ ВЫХОДЗІЦЬ НА МІЖНАРОДНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Беларускі горад Крычаў усё часцей становіцца цэнтрам увагі замежных інвестараў. Нядаўна тут быў рэалізаваны праект аўстрыйскага інвестара па вытворчасці драўняна-стружкавых пліт і створана 134 працоўныя месцы. У райцэнтры зарэгістраваны кітайскі праект ТАА «Інфэн», мэтай якога з'яўляецца вырошчванне грыбоў. А нядаўна ў Паднябеснай пабывала дэлегацыя з Крычава на чале са старшынёй райвыканкама Дзмітрыем БАЧКОВЫМ. У размове з ім мы даведаліся, якія яшчэ перспектыўныя праекты плануе рэалізаваць горад з гэтай дзяржавай, што робіцца для таго, каб прыцягнуць да прадпрымальніцкай дзейнасці мясцовае насельніцтва і што ў найбліжэйшым будучым будзе створана для развіцця бізнесу ў раёне.

— Дзмітрый Уладзіміравіч, раскажыце падрабязней пра ваш візіт у Кітай, наколькі прадукцыйнай аказалася паездка?

— У рамках візіту адбылася сустрэча з кіраўніцтвам павета Гуаньюнь правінцыі Цзянсу. Паміж народным урадам гэтага павета і нашым райвыканкамам было падпісана рамачнае пагадненне па пашырэнні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферы прадпрымальніцтва, адукацыі і турызму. Цэнтр развіцця прадпрымальніцтва ААТ «Крычаўскі рынак» будзе наладжваць стасункі з упраўленнем камерцыі павета Гуаньюнь, а сярэдняя школа № 8 абменьвацца вопытам са школай пры Нанкінскім педагагічным універсітэце. Крычаўскі раённы цэнтр турызму, краязнаўства і экскурсій дзяцей і моладзі пачне супрацоўнічаць з упраўленнем па турызме павета Гуаньюнь у рамках абмену турыстычнымі групамі. Мы праінфармавалі кітайскіх калег аб інвестыцыйным патэнцыяле нашага раёна і прапанавалі рэалізаваць праекты кітайскіх інвестараў. Таксама наведалі кампанію «Інфэн», якая рэалізуе праект у нашым раёне. Старшыня праўлення ТАА «Інфэн» Пэн Жэньюн запэўніў, што кампанія і далей будзе інвеставаць у Крычаўскі раён.

— Летась у райцэнтры прайшоў форум ініцыятыўных людзей Крычаўшчыны. Раней праводзіўся марафон мясцовых ідэй «Крычаў — горад будучага». На тэрыторыі раёна рэалізоўваецца рэгіянальны праект «Крычаў — малы разумны горад. Развіваемся разам». Што гэта дало?

— Гэта дазволіла вылучыць людзей, якія здольны стаць рухавікамі развіцця нашага раёна. Галоўнай мэтай праекта «Крычаў — малы разумны горад. Развіваемся разам» з'яўляецца павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. У яго рамках запушчана адзіная дыспетчарская служба з кароткім нумарам 115. Усе сельскія амбулаторыі падключаныя да інтэрнэту і забяспечаны праграмай «Урач агульнай практыкі». Плануецца падключэнне да сістэмы «Электронны рэцэпт», прапрацоўваецца пытанне ўкаранення запісу на прыём да ўрачоў праз інтэрнэт. У перспектыве — укараненне электроннай чаргі ў паліклініках. Летась была ўведзена ў эксплуатацыю сярэдняя школа № 8, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі. Усе камп'ютарныя класы маюць высакаскорасны доступ да інтэрнэту. У адукацыйным працэсе побач са звычайнымі падручнікамі навучэнцы выкарыстоўваюць мультымедыйныя навучальныя дапаможнікі і спецыялізаваныя базы даных. Новыя тэхналогіі ўкараняюцца ў экскурсійную дзейнасць. З мінулага года працуе афіцыйны сайт раённага музея, пастаянна распрацоўваюцца мультымедыйныя экскурсіі. Плануецца зрабіць яшчэ больш. Усё гэта паслужыць асновай для стварэння ў Крычаве цэнтра кампетэнцый па засваенні лічбавых тэхналогій і далейшага іх развіцця ў нашым рэгіёне. Летась удзел у форуме ініцыятыўных людзей прынялі дэпутаты, прадстаўнікі раённай улады, грамадскіх арганізацый, органаў самакіравання, рэлігійных суполак, індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі. У нас ёсць пэўныя дасягненні ў спорце. У раёне праводзіцца рэспубліканскі турнір па вольнай барацьбе памяці братоў Івановых, адным з арганізатараў якога выступае наш зямляк, які жыве ў Вялікабрытаніі. Ёсць у нас добрыя вынікі ў культурнай сферы, адукацыі. Юныя крычаўляне неаднаразова станавіліся пераможцамі інтэлектуальных турніраў, а нашы майстры адраджаюць традыцыі вырабу глінянай цацкі. Крычаў наогул можа стаць добрай пляцоўкай для адраджэння айчыннай аўтэнтыкі. У нас рэалізуюцца праекты, падтрыманыя Міжнародным фондам развіцця сельскіх тэрыторый, якія фінансуюцца па Праграме малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду. Летась мы рэалізавалі міні-праекты «Па гістарычных мясцінах гарадзішча» і «Стараселле. New Life». Зараз рэалізуецца праект «Палацава-паркавы ансамбль — тэрыторыя экатурызму і чыстай экалогіі». Летась былі намечаны планы, над якімі працавалі на працягу года. Хутка будзем падводзіць вынікі. Чарговы форум ініцыятыўных людзей адбудзецца ў нас 23 лістапада.

— Якая плануецца праграма форуму?

— Мы будзем разглядаць, як ідзе рэалізацыя мясцовых ініцыятыў у нашым раёне і пілотнага рэгіянальнага праекта «Крычаў — малы разумны горад. Развіваемся разам». Таксама адбудзецца прэзентацыя інвестыцыйнага патэнцыялу раёна і будзе разгледжана пытанне, як адбываецца садзейнічанне занятасці і самазанятасці насельніцтва ў раёне. Плануецца адкрыццё бізнес-інкубатара, што дасць магчымасць насельніцтву атрымліваць карысную інфармацыю для рэалізацыі сваіх ініцыятыў.

Пытанні задавала Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Чаму таннее нафта?

Кошт эталоннай маркі Brent у аўторак, 13 лістапада, упаў да $65,47 за барэль. Такім чынам, ён знізіўся на 6,6 %, што стала самым вялікім падзеннем з ліпеня, і абнавіў васьмімесячны мінімум. Яшчэ месяц таму рынкавыя гульцы дапускалі вяртанне $100, а цяпер нафта ўжо страціла каля $20 са свайго максімуму ў верасні — кастрычніку. Не засталася ўбаку і амерыканская нафта маркі WTI. Яе кошт апусціўся на 7 % — да $55,69. Пры гэтым WTI таннее ўжо 12 дзён запар — самае працяглае бесперапыннае падзенне за ўсю гісторыю гэтага інструмента з 1983 года.

Адной з галоўных прычын рэзкага абвалу Brent стала публікацыя дакладу АПЕК, што ў 2019 годзе сусветны попыт на нафту апынецца ніжэй папярэдніх чаканняў.

Абэ паабяцаў, што Японія і Расія вырашаць тэрытарыяльнае пытанне

Прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ спадзяецца, што Японія і Расія вырашаць тэрытарыяльнае пытанне і заключаць мірны дагавор на аснове пабудаванага паміж лідарамі дзвюх дзяржаў даверу. Пра гэта палітык паведаміў па выніках перагавораў з прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Прэм'ер-міністр Японіі таксама дадаў, што мае намер наведаць Расію ў пачатку 2019 года.

Міністр абароны Ізраіля пайшоў у адстаўку

Пры гэтым раней агенцтва Reuters паведамляла, што Ліберман не пакідае пасаду. «Так, я іду ў адстаўку з пасады міністра абароны Ізраіля», — сказаў ён. Палітык растлумачыў сваю адстаўку нязгодай з недастаткова жорсткімі дзеяннямі ўрада ў дачыненні да сектара Газа. «З пункту гледжання бяспекі мы павінны былі завяршыць нашы дзеянні ў сектары Газа. Той удар, які мы нанеслі па інфраструктуры тэрору ў Газе, на мой погляд, быў недастатковым».

«Калі б я застаўся на пасадзе міністра абароны, не ведаю, як бы я глядзеў у вочы жыхарам поўдня Ізраіля. У апошнія месяцы мы [Ізраіль] вядзём зусім няправільную палітыку», — дадаў Ліберман і выказаўся за больш хуткае правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона

Лот № 1. Грузовой седельный тягач MAZ 5432 03-220P, 2005 г. в., р/з АА4980-6 (инв. № по бух. учету 81036k).

Начальная цена продажи: 2 631,39 бел. руб. без учета НДС.
Сумма задатка: 263,14 бел. руб.

Аукцион состоится 18 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.
Последний день подачи заявок и внесения задатка: 17 декабря 2018 года до 15.00.
Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для внесения задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: РУП «Белоруснефть-Могилевоблнефтепродукт», УНП 790254859, Могилевская обл, Могилевский р-н, Буйничский с/с, 2

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Порядок проведения аукциона: для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лоты продаются без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 20 % от конечной цены продажи лота в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Дополнительную информацию можно получить по тел.:
+375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-974 (назначение – здание нежилое, наименование – кухня-столовая), площадью 1223,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000066, площадью 0,2172 га (назначение – содержание и обслуживание здания кухни-столовой) по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3

Начальная цена продажи – 80 000 руб. (восемьдесят тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 4 000 руб. (четыре тысячи рублей)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 422/С-739 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Авиатор»), площадью 78,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 4А

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000033, площадью 0,0138 га (назначение – для обслуживания здания магазина) по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 4А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, код – 2,7, площадью 0,0138 га; земельные участки, расположенные в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, код – 6, площадью 0,0138 га

Начальная цена продажи лота 36 000 руб. (тридцать шесть тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 800 руб. (одна тысяча восемьсот рублей)

Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26, Тел. (801514) 28-1-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 3 декабря 2018 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина, 26

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.08.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).
Последний день приема заявлений – 27 ноября 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by

Гучная справа

ЦЯРПЛІВАСЦЬ БОКАМ ВЫЙШЛА?

«Не ўсё так проста. Не ўсё адназначна. Гэта вынік тых стасункаў, якія тут гадамі складаліся», — так сёння часцей за ўсё гавораць у Юравічах, дзе адбылося рэзанансная забойства.

Пакуль у далёкім палескім аграгарадку Юравічы Калінкавіцкага раёна ідзе следства наконт гучнай крымінальнай справы, людзі размаўляюць з журналістамі на ўмовах ананімнасці: просяць не называць сапраўдных прозвішчаў, не фатаграфаваць твараў. Бо дагэтуль не ўпэўнены, як усё закончыцца на гэты раз. Затое дакладна ведаюць: шмат разоў тым, хто сёння названы падазраваным, усё сыходзіла з рук. Вось і мой суразмоўнік таксама застанецца ананімным. Але ж спачатку нагадаем сутнасць рэзанаснай справы.

У аграгарадку Юравічы Калінкавіцкага раёна ў ноч з 3 на 4 лістапада кампанія мясцовых жыхароў жорстка збіла двух мужчын і прычыніла пашкоджанні цела жонцы аднаго з пацярпелых. Вечарам 4 лістапада 45-гадовы пацярпелы памёр у бальніцы. Па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства затрымалі траіх раней судзімых грамадзян. У момант затрымання ўсе былі ў стане алкагольнага ап'янення.

Цяпер прыватнае меркаванне аднаго з жыхароў аграгарадка Юравічы наконт гэтай трагедыі і прычын, якія да яе прывялі:

— Гэта сітуацыя спела не адзін год. Забойства стала лагічным завяршэннем беспакаранасці, якая тут існавала. Усе жыхары Юравічаў пастаянна баяліся выканання пагроз. Таму большасць меркавала: абы ціха, пацерпім. Такая наша цярплівасць, якая ўсім бокам выйшла. Хоць у аграгарадку ёсць тыя людзі, якія не ішлі на повадзе ў хамства, якое доўгі час дэманстравалі крымінальныя грамадзяне. Яны ж шмат разоў змаглі выкруціцца. Калі нешта здаралася, яны пагражалі: я цябе заб'ю. Людзі так разважалі: «А што мы можам, калі ўчастковы ўсё ведае, але нічога не робіць? Ён жа з імі за руку вітаецца». Відаць, нават ночы такой не было, каб яны нешта недзе не выкралі. Адзін раз іх злавілі, калі ў хату залезлі, другі — калі сабак дваровых пастралялі. За сабак далі ўмоўны тэрмін самаму маладому. Неяк так атрымлівалася, што ўсё дарма праходзіла для гэтых людзей. Між тым, калі была гісторыя з сабакамі, — іх забойцы паднялі лямант, што быццам міліцыя іх затрымала, парушаючы іх законныя правы. І тут праваахоўнікі панаехалі, блогеры ўсялякія — іх абаранялі. Такі гвалт стварылі. Прынамсі, ніхто з праваабаронцаў нават слова не сказаў, што гэтае 17-гадовае «дзіцё» проста так пастраляла дваровых сабак. Цяпер у нас новы старшыня сельсавета, былы дырэктар школы. Ён нічога тут не можа зрабіць. Яго маці жыве цераз агароджу з гэтымі таварышамі. Канешне, не ўсё адназначна наконт матываў гэтага злачынства. Там быў нейкі канфлікт паміж тымі, з кім здарылася бойка. Але той, каго забілі, — ніяк не ўдзельнічаў у гэтых разборках. Ён проста хацеў заступіцца за суседа.

Афіцыйны прадстаўнік следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА паведаміла, што расследаванне крымінальнай справы аб забойстве і замаху на забойства вяскоўцаў працягваецца:

— З першага дня расследавання ў цэнтры пільнай увагі следчых — выяўленне прычын і ўмоў, якія спрыялі здзяйсненню злачынства. Супрацоўнікі Следчага камітэта высвятляюць якасць правядзення суб'ектамі прафілактыкі адпаведнай работы з падазраванымі, дастатковасць прынятых мер па забеспячэнні законнасці і правапарадку ў Юравічах.

Вядома, што падазраваныя на працягу доўгага часу дэманстравалі непавагу да грамадскага парадку, агрэсіўнымі паводзінамі запужвалі мясцовых жыхароў. Напрыклад, 25-гадовы вясковец сем разоў прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж і адзін раз — за незаконную здабычу рыбы. За апошнія восем гадоў ён восем разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за дробны крадзеж, распіццё спіртнога ў грамадскім месцы і парушэнне правілаў дарожнага руху. Дарэчы, тры штрафы так і не выплаціў.

20-гадовы падазраваны раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за хуліганства і пяць разоў — да адміністрацыйнай — за распіццё спіртнога ў грамадскім месцы, парушэнне ПДР. У яго адзін штраф дагэтуль не выплачаны.

17-гадовы вясковец прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж і незаконныя дзеянні ў адносінах да выбуховага рэчыва. У кастрычніку суд Калінкавіцкага раёна прызнаў непаўналетняга вінаватым у жорсткім абыходжанні з жывёламі і гвалце ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў. Яму далі два гады і адзін месяц абмежавання волі без накіравання ў выпраўленчую ўстанову і пасля абвяшчэння прысуду малады чалавек быў адпушчаны з залы суда. Між тым раённая пракуратура прынесла пратэст за мяккасць прызначанага пакарання. Дарэчы, з кастрычніка 2017 года па ліпень 2018-га непаўналетні восем разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку за захоўванне па месцы жыхарства незарэгістраванай гладкаствольнай зброі, знаходжанне ў нецвярозым стане ў грамадскім месцы, парушэнне ПДР.

Пра такіх звычайна кажуць: кляймо няма дзе ставіць. Менавіта таму злачынства выклікала вялікі грамадскі рэзананс. Псіхалагічнае становішча ў аграгарадку стала яшчэ больш напружаным пасля здзяйснення невядомай асобай падпалу дома аднаго з падазраваных. Кіраўніцтва Следчага камітэта па Гомельскай вобласці правяло сельскі сход з мясцовымі жыхарамі. Марыя Крываногава расказвае, што ўсе меркаванні вяскоўцаў наконт крымінагеннага становішча ў Юравічах зафіксаваны:

— Нашы супрацоўнікі давялі вяскоўцам інфармацыю пра тое, як ідзе расследаванне крымінальнай справы, зафіксавалі іх меркаванні пра крымінагеннае становішча ў Юравічах, расказалі пра магчымасць ужывання мер бяспекі ў дачыненні да сведак, акцэнтавалі ўвагу на мерах крымінальнай адказнасці за здзяйсненне некаторых відаў злачынстваў, у тым ліку за падпал і неданясенне пра злачынства. Расследаванне крымінальнай справы працягваецца, яно знаходзіцца на асабістым кантролі начальніка УСК па Гомельскай вобласці. Дарэчы, падчас правядзення следчых дзеянняў і аператыўных мерапрыемстваў былі ўстаноўлены новыя факты па акалічнасцях здзейсненага злачынства. Выяўлены яшчэ адзін эпізод супрацьпраўнай дзейнасці двух затрыманых. Па даных следства, сёлета ў сакавіку двое мясцовых жыхароў, 1998 і 2001 гадоў нараджэння, выкарыстоўваючы тапарышча, збілі свайго аднавяскоўца.

На падставе сабраных па справе доказаў следствам 14 лістапада двум старэйшым грамадзянам прад'яўлена абвінавачанне па артыкулах аб забойстве чалавека і замаху на забойства трох чалавек, здзейсненых групай асоб. 20-гадоваму і непаўналетняму — па артыкуле аб асабліва злосным хуліганстве. Усе трое знаходзяцца пад вартай.

УСК па Гомельскай вобласці звяртаецца да грамадзян, якія валодаюць інфармацыяй пра супрацьпраўную дзейнасць падазраваных, з просьбай паведаміць яе супрацоўнікам Следчага камітэта па тэлефонах: (8 0232) 69-31-23, (8 029) 743-75-45.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

На дарозе

Час небяспекі: будзьце пільныя!

Учора каля 11 гадзін дня на 176-м кіламетры трасы М10 «Мяжа Расійскай Федэрацыі — Гомель — Кобрын» адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, у якім загінулі пяць чалавек. Трагічны інцыдэнт здарыўся за пяць кіламетраў ад населенага пункта Малыя Аўцюкі (Калінкавіцкі раён, Гомельская вобласць). Мікрааўтобус «Фольксваген-Транспарцёр» з пасажырамі выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе сутыкнуўся з малакавозам МАЗ. У выніку пяць пасажыраў VW (усе жанчыны) памерлі на месцы аварыі. Кіроўца быў дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне...

Таксама пяць чалавек пацярпелі ў аварыі з удзелам рэйсавага мікрааўтобуса ў Смаргонскім раёне, паведамілі ў галоўным упраўленні аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама. Мікрааўтобус «Мерседэс» рухаўся па маршруце Смаргонь — Гродна. Каля шасці гадзін раніцы паблізу вёскі Солы з-за моцнага дажджу кіроўца не справіўся з кіраваннем, у выніку чаго аўтамабіль вылецеў у кювет і перакуліўся на бок. У бальніцу даставілі пяць чалавек. Пасля агляду трох з іх адпусцілі дадому. Двое мужчын шпіталізаваныя...

Так, надвор'е псуецца, дарожныя ўмовы робяцца складанымі, светлавы перыяд — кароткі. І дарэчы, надыходзіць зіма, з усімі вынікаючымі... ДАІ рэкамендуе загадзя паклапаціцца аб падрыхтоўцы свайго аўтамабіля да эксплуатацыі ў зімовы перыяд.

Першае, з чаго варта пачаць, — гэта колы, а менавіта аўтамабільныя шыны. Ад пакрышак, іх якасці і надзейнасці залежыць бяспека руху. Ва ўмовах галалёдзіцы і снежнага накату зімовыя шыны дапамагаюць скараціць тармазны шлях і значна паляпшаюць кіраванне аўтамабілем. Пры нізкіх тэмпературах летняя гума «дубее» і перастае выконваць свае функцыі па забеспячэнні добрага счаплення з дарожным пакрыццём, выкарыстанне такіх шын становіцца небяспечным. І калі пакуль вы яшчэ можаце разважаць, мяняць ці не мяняць гуму, хоць лепш гэта зрабіць цяпер, каб пазбегнуць чэргаў на шынамантажах, то з 1 снежня па 1 сакавіка выкарыстанне зімовых шын становіцца абавязковым патрабаваннем. У гэты перыяд іх адсутнасць будзе пагражаць адміністрацыйным спагнаннем.

Неабходна праверыць агульны стан сістэмы ацяплення: ад яе спраўнасці залежыць магчымасць бесперашкодна назіраць праезную частку і дарожную абстаноўку перад сабой і па баках. Важна праверыць спраўнасць фар і габарытных агнёў. Не будзе лішнім замяніць шкло-ачышчальнікі, абмывальнік ветравой шыбы неабходна заправіць спецыяльнай незамярзальнай вадкасцю.

Варта і самім перастроіцца на зімовы стыль кіравання. Выбіраць бяспечную хуткасць і дыстанцыю з улікам стану праезнай часткі, адмовіцца ад рызыкоўных манеўраў і бясконцых перастраенняў з шэрагу ў шэраг, пазбягаць рэзкіх тармажэнняў, павысіць пільнасць пры праездзе пешаходных пераходаў. Неабходна абдумваць кожнае сваё дзеянне, кіраваць транспартам спакойна і акуратна.

Пешаходам важна разумець, што на слізкай дарозе ў разы павялічваецца тармазны і прыпыначны шлях любога транспартнага сродку. Пры ўжыванні экстраннага тармажэння аўтамабіль можа сысці ў некіраваны занос. У сувязі з гэтым пешаходам не варта рызыкаваць уласнай бяспекай, неабходна пераходзіць дарогу ва ўстаноўленых месцах і толькі пераканаўшыся, што ўсе аўтамабілі паспелі спыніцца. Ва ўмовах недастатковай бачнасці пазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі, якія дапамагаюць кіроўцу своечасова заўважыць чалавека на дарозе.

Сяргей КУЛАКОЎ, Сяргей РАСОЛЬКА.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества. Торгового коммунального унитарного предприятия «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

Таблица № 1

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %	№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %
1	Тележка гидравл. 2500 кг 1150*550 мм	210,24	3	Шкаф-купе 1774-450-2156	35,19
2	Тележка гидравл. АС 25 1073	35,07	4	Кап. строение № 500/С-36629, площадь – 1414 кв. м	279 000,00

В отношении лотов № 1 – № 3 проводятся четвертые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 17.10.2018 в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 40 %. Окончание приема заявлений в 16.00 27.11.2018.

В отношении Лота № 4 проводятся четвертые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 17.10.2018 в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 25 %. Окончание приема заявлений в 16.00 27.11.2018. Лот № 4 расположен по адресу: г. Минск, ул. Селицкого, д. 39, на земельном участке с кадастровым номером 500000000000800170 площадью 0,2813 га, который предоставлен на праве временного пользования

Таблица № 2

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20%	№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20%
1	Строительные товары в ассортименте (перечень https://sites.google.com/site/pcjuristcom/stroitelnye-tovary)	9 616,71	3	Утеплитель top 35 мм (2,5х0,58; толщ. 35, 511 шт.)	4 428,29
2	Утеплитель top 20 мм (2,5х0,75; толщ. 20, 159 шт.)	1 017,96			

В отношении имущества, указанного в таблице № 2, проводятся вторые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 17.10.2018 в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 20 %. Окончание приема заявлений в 16.00 27.11.2018 г.

Дата и время проведения торгов (Таблица № 1)	**28 ноября 2018 года в 14.00 (регистрация с 13.40 до 13.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости предмета торгов
Задаток	10 % от начальной стоимости предмета торгов

Информация о продавце	Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ», г. Минск, ул. Селицкого, д. 39 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10)
Условия для участия в торгах	1. Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah. 2. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту № __ (Таблица №_), проводимых __.__.2018. 3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. 4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи (при покупке объекта недвижимого имущества – 1 месяц с даты регистрации договора купли-продажи). 5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – Андрей, тел. +375 29 304 25 60. 7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: • 8 (029) 305 86 50 • e-mail: frondera@mail.ru

АПАВЯШЧАЛЬНІКІ БЕЗ БАТАРЭЕК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Звонку інтэрнат па вуліцы Д. Беднага, 7 (цяпер Мікольскай) выглядае даволі аптымістычна: цагляная дзевяціпавярховая пабудова з сіненькімі балкончыкамі. Унутры нядаўна пафарбаваныя сцены ў калідорах і адсутнасць прыкмет агульнага разбурэння. Але ж менавіта тут на працягу доўгага часу спецыялісты МНС выяўляюць адны і тыя ж небяспечныя парушэнні, сцвярджае афіцыйны **прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Марыя КЛЯЗОВІЧ:**

— Штодзень на тэрыторыі Гомельскай вобласці праводзяцца маніторынгі стану пажарнай небяспекі аб'ектаў. Асаблівая ўвага аддаецца правільным дзеянням персаналу ў выпадку ўзнікнення пажару.

Загадчык інтэрната Генадзь Сцепаненка пра парушэнні пажарнай бяспекі ведае добра і сам дэманструе вогнетушыцелі, якія аж з 2010 года не перазараджаліся. А значыць, зусім няма ўпэўненасці, што яны спрацуюць у неабходны момант. Інспектары МНС дадаюць, што пры гэтым не забяспечана пастаянная гатоўнасць і іх да выкарыстання (як і супрацьпажарнага водазабеспячэння), бо ключы ад шаф, дзе знаходзяцца першасныя сродкі пажаратушэння, — на вахце, што на першым паверсе будынка.

А яшчэ высвятляецца, што пры эвакуацыі няма магчымасці адчыніць дзверы ў будынку знутры без дапамогі ключа. А тыя дзверы, якія некалі былі здольныя абараніць ад пажару, даўно зламаныя. Загадчык установы кажа, што ў такім выглядзе іх прымаў ад папярэдніка і ў рабочым стане нават ніколі не бачыў.

Аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі ў пакоях інтэрната ўсталяваны былі даўно. Сёння ж яны з'яўляюцца сумнеўным дэкаратыўным элементам, бо літаральна ва ўсіх адсутнічаюць батарэйкі. Купляць новыя ніхто не збіраецца.

Калі размова заходзіць пра агульную сігналізацыю, высвятляецца, што ёсць толькі яе праект і наўрад ці дойдуць рукі да яго ўвасаблення: па прычыне адсутнасці фінансаў ва ўладальніка — філіяла «Будаўніча-мантажны поезд № 716» ААТ «Трэст Белтрансбуд».

Начальнік філіяла Юрый Носаў пасаду займае год і кажа, што інтэрнат для яго арганізацыі — камень на шыі, які зняць нельга і цягнуць больш няма магчымасці. Прызнаецца:

— Пажарную аўтаматыку наўрад ці зробім. Сто тысяч рублёў у нас няма. Гэта ж двухмесячны фонд заработнай платы. Як заробім грошы, так і будзем ліквідаваць выяўленыя недахопы. Я даўно хацеў аддаць гэты інтэрнат гораду, але ніхто яго не прымае. Тут некалькі разоў праводзілася абследаванне КЖРЭУП «Савецкае». Але, каб перадаць будынак ім на баланс, трэба правесці шэраг мерапрыемстваў па бягучым рамонце, аднаўленні фасада, па пажарнай бяспецы... Усё гэта вельмі дорага каштуе, а грошай у нас няма. Цяпер наша галаўная арганізацыя знаходзіцца ў рэжыме санацыі. Па законе ў нас ёсць магчымасць перадаць будынак інтэрната дзяржаве ў цяперашнім стане. Спадзяюся, што хутка гэты будынак пяройдзе іншаму ўласніку.

Тым часам інспектары МНС цікавяцца ў жанчыны на вахце, якая мае бэйдж «швейцар», пра алгарытм дзеянняў пры пажары. Таццяна Бурцава адказвае ўпэўнена, але не зусім дакладна:

— У надзвычайнай сітуацыі набяру 101, 112, потым апавяшчу кіраўніка нашай арганізацыі, потым — па тэлефонах усіх людзей, што знаходзяцца ў інтэрнаце. Адчыняю запасныя выхады, і ўсе эвакуіруюцца.

Між тым інспектар папраўляе: у надзвычайнай сітуацыі начальства трэба апавяшчаць у самую апошнюю чаргу, а найперш важна клапаціцца пра людзей, якія трапілі ў небяспеку. Да таго ж у інтэрнаце павінна быць добраахвотная пажарная дружына, у якой абавязкі размеркаваны: хто сустракае пажарных, хто дапамагае эвакуіраваць людзей, хто — тушыць пажар...

Зараз тут жывуць 37 чалавек, якія займаюць 26 пакояў. Сямейныя, з дзецьмі — на самых верхніх паверхах. Ніхто з іх не разлічвае на дадатковыя жыццёвыя прыгоды, але ж ратавальнікі маюць рацыю і сумны досвед. Таму патрабуюць ужо сёння зрабіць жыццё людзей бяспечным.

Замест пасляслоўя. *У Гомельскім абласным упраўленні МНС паведамілі: у дачыненні да асоб, якія дапусцілі парушэнні ў інтэрнаце, будзе распачаты адміністрацыйны працэс.*

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Традыцыйныя каштоўнасці

Ідэальная сям'я = ідэальная дзяржава

Што такое ідэальная сям'я? «Гэта поўная сям'я, дзе ёсць бацька і маці, трое і больш дзяцей, дзе шануюць сваіх продкаў. Гэта зарэгістраваны шлюб з добрым псіхалагічным кліматам. І нам трэба паказваць і актыўна прасоўваць гэтую ідэальную мадэль традыцыйнай беларускай сям'і», — лічыць міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ірына КАСЦЕВІЧ. Гэтае меркаванне яна выказала журналістам на пачатку работы VI Форуму «Святасць мацярынства», які праходзіць гэтымі днямі ў Мінску.

— Мы назіраем у свеце трансфармацыю сямейных каштоўнасцяў. Таму наша задача — захоўваць і ўмацоўваць інстытут сям'і, — сказала Ірына Касцевіч.

У якасці прыкладу міністр працы і сацабароны прывяла той факт, што сёння 2 % ВУП краіны выдаткоўваецца на дапамогі сем'ям з дзецьмі. Імі ў нас ахоплена кожнае трэцяе дзіця. У жыллёвай палітыцы дзейнічае шэраг указаў, якія гарантуюць пагашэнне часткі або ўсёй сумы запазычанасці па крэдытах для шматдзетных сем'яў. Згодна з працоўным заканадаўствам, мама траіх і больш малых мае права на адзін свабодны аплатны дзень. Шматдзетныя маці раней выходзяць на пенсію... Як вынік, у рэйтынгу краін, спрыяльных для мацярынства і нараджэння дзяцей, Беларусь сярод 179 дзяржаў займае 25-е месца і першае — сярод краін СНД.

Вядома, яшчэ ёсць напрамкі, якія трэба актыўна развіваць. У прыватнасці, на думку Ірыны Касцевіч, нам неабходна ствараць пазітыўнае інфармацыйнае поле, у якім сям'я з дзецьмі пазіцыянуецца як вялікае шчасце і гонар.

Прывітанне арганізатарам і ўдзельнікам VI Форуму Усерасійскай праграмы «Святасць мацярынства» накіраваў Аляксандр Лукашэнка. У ім выказваецца ўпэўненасць, што форум будзе садзейнічаць абмену вопытам, выпрацоўцы цікавых ідэй і новых ініцыятыў па ўмацаванні інстытута сям'і, паслужыць больш цеснаму супрацоўніцтву міжнароднай супольнасці ў імя шчасця і здароўя нашых дзяцей, на карысць будучых пакаленняў.

Разам з тым, як лічыць **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня Беларускага саюза жанчын Мар'яна ШЧОТКІНА,** вельмі важным пытаннем з'яўляецца забеспячэнне гендарнай роўнасці:

— Сучасныя жанчыны ўжо не могуць закрыць сябе толькі ў рамках сям'і. Яны імкнуцца да фінансавай самастойнасці, робяць стаўку на паспяховую кар'еру, з'яўляюцца актыўнымі ўдзельніцамі фарміравання грамадзянскай супольнасці.

Як адзін з пунктаў росту Мар'яна Шчоткіна адзначыла развіццё жаночага прадпрымальніцтва. Але адной з праблем з'яўляецца сумяшчэнне прафесійных і сямейных абавязкаў. «Як паказала абследаванне па выкарыстанні часу, хатняй гаспадарцы і доглядзе дзяцей жанчыны аддаюць у два разы больш часу, чым мужчыны. Гэтыя падыходы трэба мяняць, пазбаўляцца ад стэрэатыпаў, каб раскрываць патэнцыял жанчын, пашыраць іх магчымасці для сумяшчэння розных роляў».

Намеснік старшыні Дзяржаўнай думы Федэральнага Сходу Расіі Вольга ЕПІФАНАВА падкрэсліла, што Прэзідэнтам Расіі цяпер абвешчана Дзесяцігоддзе дзяцінства, прынята вялікая колькасць заканадаўчых актаў для падтрымкі сям'і, жанчын, дзяцей, у тым ліку ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. «Думаю, што ў Беларусі таксама шмат робіцца ў гэтай сферы. Таму абмен інфармацыяй для нас узаемавыгадны», — адзначыла яна.

«Спадзяёмся, што абмен вопытам дапаможа абедзвюм нашым краінам рабіць яшчэ больш дзеля павышэння прэстыжу сям'і», — упэўнена і **старшыня апякунскай рады Усерасійскай праграмы «Святасць мацярынства» Наталля ЯКУНІНА.**

Форум «Святасць мацярынства», прысвечаны сям'і ў сучасным свеце: яе значэнню, тэндэнцыям і перспектывам, — сабраў у Мінску больш за 400 удзельнікаў з Расіі, Беларусі, Сербіі, Грузіі, Ізраіля, Кітая, ЗША, Польшчы і іншых краін. Арганізатарамі форуму з'яўляецца Фонд Андрэя Першазванага (Расія) сумесна з Фондам братоў Карыч (Сербія) пры падтрымцы Мінгарвыканкама і Мінпрацы і сацабароны Беларусі.

Святлана БУСЬКО.

Проведение четвертых повторных торгов по продаже имущества ЧУП «ФАЙВ СТАРС ПЛЮС»

№ лота	Наименование лота	Начальная цена (снижена на 70 %), руб.	Сумма задатка, руб.	Шаг торгов 5 %, руб.
1	Компрессорно-конденсаторный блок с дополнительным элементом Clint MHA-182	4 620,00	462,00	231,00

Местонахождение**: Минская обл., Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 38.**
Торги в форме аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, каб. 18
начало – **3 декабря 2018 г., в 10.00**.

Письменная заявка на участие в торгах и электронная копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, должна быть подана с 09.00 15.11.2018 по 18.00 30.11.2018 на адрес электронной почты организатора торгов: ooo.business.way@gmail.com **в фомате «.pdf».**

Задаток на участие по лоту составляет 10 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **30.11.2018** на расчетный счет продавца – ЧТУП «ФАЙВ СТАРС ПЛЮС», 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, пом. 503, каб. 4, р/с BY05 BPSB 3012 1651 0101 7933 0000, в ОАО «БПС-Сбербанк», Минская рег. дирекция № 700, код BPSBBY2X, УНП 100959852, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в торгах **03.12.2018.** Организатор торгов: ООО «БизнесУэй», г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, ком.18, тел. +375(29)165-33-65. Продавец: **ЧУП «ФАЙВ СТАРС ПЛЮС».** Лицо, ответственное за хранение имущества: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84. Ознакомиться с лотом можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия. В случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного претендента лот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в размере **1 092,81 руб.** Срок подписания договора купли-продажи по 13.12.2018. Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в открытых торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by.

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	– Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-332622, площадью 60,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Зайцева, 67-3. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007001186 площадью 0,1037 га	**97 400,00**	**9 740,00**
Срок подачи заявления	**По 26 ноября 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1		
Дата, время и место проведения аукциона	**28 ноября 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1		
Номер р/с для перечисления задатка	BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете *«Звязда» от 15.11.2018 г.*		
Условия продажи	Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 3 (три) месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.08.2018 г.		

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

«Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» приобретает акции собственного выпуска

Полное наименование, местонахождение покупателя акций	Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, контактный телефон 8 0232 35 91 02
Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого покупаются	Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, контактный телефон 8 0232 35 91 02
Цель приобретения акций	Для дальнейшей продажи инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом эмитента, с целью развития акционерного общества
Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель	4000 (четыре тысячи) простых (обыкновенных) акций
Цена приобретения акций	11,00 (одиннадцать) рублей 00 копеек
Порядок и форма расчета оплаты акций	Оплата не позднее 60 (шестидесяти) банковских дней с даты заключения договора купли-продажи путем безналичного расчета
Адрес, по которому будет заключаться договор купли-продажи	246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», контактный телефон 8 0232 35 91 02
Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	Предложение о продаже акций принимаются с 19 ноября 2018 г. по 19 декабря 2018 г. Если общее количество предложенных для приобретения акций превысит 4000 штук, то акции приобретаются пропорционально заявленным предложениям
Дата начала и окончания заключения договоров купли-продажи акций	С 20 декабря 2018 г. по 31 января 2019 г.

УНП 400052115

Страховые полисы карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY07 № 15175461–15175467 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной в связи с утерей.**
УНП 100357923

Сямейная газета

Выпуск № 21 (112)

«ФЕФЕКТ ФІКЦЫІ»

Калі гэты выраз чуюць нашы бацькі і бабулі з дзядулямі, то практычна адразу ўспамінаюць іншыя крылатыя дыялогі з фільма «Па сямейных абставінах», а менавіта: «Скажи «девочка». — «Девочка». — «Скажи «ыба». — «Селёдка!» і «фіццаць фе» літары алфавіта. Сучасныя маладыя бацькі большасці гэтых «лагапедычных» цытат не ведаюць — затое, на жаль, шчыльна знаёмыя з самімі лагапедамі. Недаразвіццё маўлення, алалія — маторная ці сэнсарная, афазія, дызартрыя, заіканне, дыслексія, дысграфія — кагосьці гэтыя дыягназы завочна палохаюць, а для кагосьці яны — дадзенасць, з якой трэба нешта рабіць. Перадусім — знайсці добрага лагапеда-дэфектолага, які не толькі мае адпаведную адукацыю і стаж працы, але з якім і дзіця пойдзе на кантакт, і бацькі будуць на хвалі ўзаемаразумення.

Зноў жа прадстаўнікі старэйшага пакалення, па-першае, схільныя перамяншаць значнасць праблемы — што, дзіця не гаворыць ці дрэнна гаворыць? Ат, перарасце, вунь, Леанарда да Вінчы да чатырох з паловай гадоў наогул маўчаў, а Эйнштэйн да сямі гадоў быў коснаязыкім, а якія людзі выраслі! Па-другое, часта нават педыятры лічаць крыніцай усіх маўленчых бед нашу нядбайнасць і «тэхналагізаванасць» — маўляў, юным матулям прасцей даць у рукі дзіцяці смартфон або планшэт, чым пачытаць яму казку, а вось калі б удзялялі малому больш увагі, то і праблем не было б. Аднак неўролагі і лагапеды гавораць, што гэта толькі вяршыня айсберга, бо ўнутраных і знешніх прычын узнікнення маўленчых праблем, цяжкасцяў з чытаннем або пісьмом значна больш. І выяўляюцца яны не толькі ў мноства цяперашніх дзяцей, але нават у дарослых — балазе, сёння дыягностыка працуе ў разы лепей, чым «ццаць» гадоў таму. Але рэч у тым, што чым раней выяўляюць парушэнне, тым больш паспяховай будзе яго карэкцыя. Проста камусьці на «пастаноўку» аднаго-двух гукаў спатрэбіцца некалькі месяцаў, камусьці на выпраўленне больш сур'ёзных праблем — шмат гадоў і бяздонны запас цярпення, камусьці дыягназ атруціць усё жыццё, а хтосьці можа шчаслива картавіць да старасці і ніколькі гэтым не абцяжарвацца.

...У маёй малодшай дачкі, мяркуючы па частаце згадак, улюбёны сябар... Лагапед дзіцячага садка Аліна Уладзіміраўна. Выбягаючы з дзвярэй групы, малая цягне мяне менавіта да яе дзвярэй, а па дарозе дадому расказвае — хоць з большага і на «дзіцячай кітайскай», — што сёння яны чыталі казкі альбо гаварылі пра садавіну, цацкі, сваякоў... І я бязмежна ўдзячная гэтаму педагогу, якая ўмее зацікавіць, разгаварыць нават самае заціснутае і сарамлівае малое, растлумачыць дзецям са звычайных, нелагапедычных груп, што «фефект фікцыі» — гэта не загана і не хвароба, а бацькам не стамляецца даводзіць і нагадваць, што мы ўсе — каманда, ад зладжанасці якой залежыць вынік. «Не чакайце, што ўсё само пройдзе, але і ні ў якім выпадку не стаўце крыж на сваім дзіцяці — чым больш мы працуем, праводзім масаж, фізіяпрацэдуры і гэтак далей, тым лепш. І нават калі вы дрэнна разумееце сваё дзіця, хіба ад гэтага любіце яго менш?» — гаворыць яна на бацькоўскіх сходах. І гэтыя некалькі фраз даюць надзею, што рана ці позна дзіця пяройдзе з «кітайскай дзіцячай» на нармальную мову і наогул усё ў нас атрымаецца.

Так што дзякуй, Аліна Уладзіміраўна. Вам і іншым спецыялістам, якія дапамагаюць дзецям і дарослым гаварыць, чытаць і лепш разумець адзін аднаго, — хай сабе мы і не Эйнштэйны. З Міжнародным днём лагапеда вас!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

50+: жыць цікава

«ГАЛАВА? А ЧАМУ ЯНА ПАВІННА БАЛЕЦЬ?!»



Лічыце неверагодным? А цяпер уважліва паглядзіце на фота, перш чым працягваць чытаць артыкул далей, і адкажыце сабе на пытанне: «Ці дасі гэтай жанчыне столькі гадоў?» Здаецца, адказ відавочны.

Нінель Блахіну ведаю ўжо некалькі гадоў, але кожны раз, калі лёс даруе шанц чарговы раз падтрымаць нашы стасункі, раблю тое з вялікім задавальненнем, бо гэта жанчына не проста дзеліцца сваёй магутнай энергетыкай, а на сваім асабістым прыкладзе даказвае — узросту і старасці няма наогул, вы выглядаеце так, як самі сябе адчуваеце. Нездарма год таму яна прыняла ўдзел у вядомай праграме Максіма Галкіна «Старэйшы за ўсіх», дзе палымяна станцавала рок-н-рол — усім на зайздрасць!

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

ЗРАЗУМЕЦЬ І ДАРАВАЦЬ?

Што павінны ведаць бацькі пра пакаранне і заахвочванне дзяцей

Ці варта караць дзяцей? Ці можна ляпнуць ніжэй спіны ці даць па руках, калі яно «не разумее па-іншаму»? Што вырасце з дзіцяці, якога ніколі не каралі? Ці варта матэрыяльна заахвочваць добрыя адзнакі? І чаму ў вайне паміж бацькамі і дзецьмі не бывае пераможцаў? Пра гэта мы распыталі псіхолага Гарадскога дзіцячага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Галіну СТАНЧЫК.

Караць нельга растлумачыць

— Галіна Антонаўна, ці трэба караць дзяцей? Ці магчыма іх выхаваць без пакарання?

— Напэўна, усе чулі пра цэлую сістэму выхавання без пакарання, ёй прысвечаны шматлікія артыкулы і кнігі. Але на гэты конт ёсць анекдатычная гісторыя, калі ў транспарце сядзіць дзіця і пэцкае абуткам белае паліто жанчыны, якая знаходзіцца насупраць. Яна просіць маці яго супакоіць, на што тая адказвае: маўляў, сваё дзіця яна не карае, а выхоўвае па асаблівай сістэме. Тут да гэтай матулі падыходзіць малады чалавек, дастае з рота жвачку і прыклейвае ёй на лоб са словамі: «Мяне таксама выхоўвалі без пакарання»... Напэўна, бацькі, калі вырашаюць для сябе гэта пытанне, з жахам уяўляюць, як іх любімае дзіця можа вырасці монстрам, таму выкарыстоўваюць пакаранне як непазбежны і надзейны метад выхавання. Як жа яны губляюцца, калі аднойчы дзіця само прыносіць папружку і кажа: можаце мяне пабіць, але за ўрокі я не сяду. Ці само ўстае ў кут: я буду стаяць хоць усю ноч, але спаць не пайду. Таму бацькам трэба разумець, што такія метады хоць і працуюць, але вельмі абмежаваны час. А выхоўваючы без фізічнага ўздзеяння, мы ўсё ж такі думаем і працуем на будучыню. Фізічнае пакаранне, той жа кут ці пазбаўленне чагосьці эфект прыносяць не заўсёды. Часам пакаранне для дзяцей бывае перанесці лягчэй, чым зрабіць тое, чаго ад іх патрабуюць. Для бацькоў гэта нагода задумацца, чаму дзіця штосьці не выконвае: не хоча або не можа? Часцей за ўсё яно проста не можа выканаць пэўныя патрабаванні. Часам бацькі спрабуюць кіраваць дзіцем, якое не можа кіраваць сабой. Напрыклад, вы крычыце: «Зараз жа перастань плакаць!» А яно працягвае. І робіць гэта не на злосць вам. Яно проста не можа кіраваць сабой. Часта ад бацькоў даводзіцца чуць меркаванне, што важна пакараць дзіця, каб яно ведала, што за праступкам абавязкова надыдзе кара. Па прынцыпе «скраў — павінен сядзець у турме». Але ў адносінах бацькоў і дзяцей гэта працуе дрэнна. І трэба дакладна ўсведамляць, што дзеці, асабліва сучасныя, хутка разумеюць, што наша ўздзеянне абмежавана. І пытанне «А што ты мне зробіш?» часта задаюць не падлеткі, а дзеці 7—8 гадоў, а часам і меншыя.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Як дзяржава падтрымлівае сем'і, што выхоўваюць дзяцей

Тры пытанні да Міністэрства працы і сацыяльнай абароны

Раскажыце, калі ласка, на якую дапамогу па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў могуць разлічваць жанчыны — індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі? Можа, у найбліжэйшы час плануюцца нейкія заканадаўчыя змены, якія іх закрануць?

Юлія Цынкевіч, *г. Віцебск.*

Адказвае кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ:

— Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў вызначаецца ў залежнасці ад колькасці дзяцей, якія выхоўваюцца ў сям'і, і занятасці асобы, што ажыццяўляе догляд дзіцяці.

Поўны памер дапамогі ўсталяваны для сем'яў, у якіх адзін з бацькоў, які ажыццяўляе догляд дзіцяці, страчвае ў сувязі з гэтым прыбытак або працуе па працоўным дагаворы (кантракце) на ўмовах не больш за палову месячнай нормы працоўнага часу альбо дома.

Дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў і рамеснікаў прадугледжвае самастойную арганізацыю сваёй занятасці і не рэгулюецца нормамі заканадаўства аб працы (не прадугледжвае нармавання рабочага часу, давання працоўных і сацыяльных водпускаў, устанаўлення мінімальнага ўзроўню аплаты працы).

Калі ў перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў асобы ажыццяўляюць прадпрымальніцкую ці рамесніцкую дзейнасць, то дапамогі ім прызначаюцца і выплачваюцца ў памеры 50 % ад поўнага памеру.

Разам з тым індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі маюць такія перавагі, як магчымасць самастойна арганізоўваць рабочае месца і рабочы час; карыстацца правам выплаты абавязковых страхавых унёскаў у бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва пры жаданні мець дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне — гэта значыць, выплачваць унёскі ў бюджэт фонду ў добраахвотным парадку.

Акрамя таго, у іх ёсць магчымасць атрымліваць дапамогу ў поўным памеры ў выпадку прыпынення адпаведнай дзейнасці, у тым ліку ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, а таксама неажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ў сувязі са знаходжаннем у працэсе спынення дзейнасці. Пры гэтым індывідуальныя прадпрымальнікі і рамеснікі не абмежаваныя ў працягласці і перыядычнасці прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Працэдура прыпынення і аднаўлення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў максімальна спрошчана і заключаецца ў падачы адпаведнай заявы ў падатковыя органы.

У выпадку прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў дапамога ў поўным памеры выплачваецца з першага чысла месяца, наступнага за месяцам прыпынення дзейнасці. Пры аднаўленні дзейнасці перараслік дапамогі ў памеры 50 % ад устаноўленага памеру здзяйсняецца з першага дня месяца, наступнага за месяцам, у якім дзейнасць была адноўлена.

Што датычыцца ўнясення змяненняў у заканадаўства, у цяперашні час яны не плануюцца.

* * *

Куды звяртацца па прызначэнне дапамог на дзяцей, калі бацькі працуюць у некамерцыйнай арганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек?

Аляксандр Іўчанка, *г. Бяроза.*

— Парадак прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, рэгулюецца нормамі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Месца прызначэння дзяржаўных дапамог вызначана ў арт. 21 закона. Дзяржаўныя дапамогі жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, у сувязі з нараджэннем дзіцяці, па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, а таксама сем'ям на дзяцей ва

ўзросце ад 3 да 18 гадоў, у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў прызначаюцца ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў выпадку, калі:

1) абодва бацькі ў поўнай сям'і ці адзін з іх у няпоўнай сям'і, усынавіцель (удачарыцель), апякун (папячыцель) дзіцяці:

працуюць у камерцыйных арганізацыях з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек уключна;

працуюць у рэлігійных арганізацыях;

з'яўляюцца святарамі;

2) маці (мачаха) дзіцяці ў поўнай сям'і працуе ў камерцыйнай арганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек уключна або ў рэлігійнай арганізацыі.

Калі арганізацыя з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек уключна некамерцыйная, і пры гэтым яна не адносіцца да рэлігійнай арганізацыі, дзяржаўныя дапамогі выплачваюцца не ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, а ў самой арганізацыі.

* * *

У нас у сям'і дзіця-інвалід (старэйшае за 3 гады), мая жонка не працуе, даглядае яго і атрымлівае ў органах сацыяльнай абароны дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Ці можна мне прызначыць па месцы працы яшчэ адну дапамогу на дзіця-інваліда?

Сяргей, *г. Мінск.*

Начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вера ЛАБКОВІЧ:

— Калі ў сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід, па месцы працы аднаго з бацькоў выплачваецца дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, якая назначаецца штогод пры выкананні ўмоў занятасці бацькі (айчыма) у поўнай сям'і ці аднаго з бацькоў у няпоўнай сям'і. Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў прызначаецца толькі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Права на яго прызначэнне разглядаецца незалежна ад атрымання на дзяцей, у тым ліку на дзіця-інваліда, іншых відаў дзяржаўных дапамог.

Таму, калі ў поўнай сям'і маці атрымлівае ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а бацька працуе, па месцы працы бацькі прызначаецца іншы від дзяржаўнай дапамогі — дапамога на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў. Пры гэтым дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца на кожнае дзіця, старэйшае за 3 гады: на дзіця-інваліда ў памеры 70 % бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, на іншых дзяцей — 50 % (пры выкананні бацькам умоў занятасці).

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

Прававая гасцёўня

ДЭКРЭТНЫ АДПАЧЫНАК ЦАЛКАМ І ЧАСТКАМІ

Колькі разоў выходзіць на работу і вяртацца ў дэкрэт на працягу трох гадоў, вызначае жанчына

Тры месяцы таму я знаходзілася ў дэкрэце. Калі малому споўнілася два гады, вярнулася на работу. Аднак не заладзілася з дзіцячым садком, таму вырашыла вярнуцца і дабыць з сынам тэрмін па доглядзе за дзіцем да трох гадоў, які дазваляе наша заканадаўства. Аднак кіраўніцтва сказала, што я не магу так зрабіць. Выйшла — значыць, працуй. Прапануе сыходзіць у адпачынак за свой кошт альбо ў наступны дэкрэт з другім дзіцем. Ці маюць яны рацыю ў такіх патрабаваннях? Мая сяброўка, казала, што яна так рабіла: выходзіла на работу і вярталася назад у дэкрэт і нават грошы дэкрэтныя не страчвала. Ці такія магчымасці залежаць ад канкрэтнага прадпрыемства?

Вольга Ч., *г. Мінск.*

На пытанне адказвае Дар'я ГРЫЦКЕВІЧ, галоўны спецыяліст упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:

— Водпуск па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў замацаваны ў артыкуле 185 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Абавязак наймальніка — даць гэты водпуск па жаданні працуючай жанчыны на падставе яе пісьмовай заявы незалежна ад працоўнага стажу. Яна можа выкарыстаць яго поўнасцю або падзяліць на часткі любой працягласці. Так што **адмовіць у вяртанні ў дэкрэтны адпачынак нават пасля выхаду на работу наймальнік не мае права.** Вы можаце выходзіць на работу і вяртацца ў дэкрэт столькі разоў, колькі трэба, разбіваць яго на пэўныя перыяды і выкарыстоўваць часткамі любой працягласці, пакуль дзіцяці не споўніцца тры гады.

Звяртаю вашу ўвагу, што заканадаўствам не прадугледжаны тэрмін, за які трэба папярэдзіць наймальніка аб намеры пайсці ў водпуск па доглядзе за дзіцем да трох гадоў. Гэты водпуск прадастаўляецца з даты, якая пазначана ў заяве.

Акрамя таго, у выпадку выхаду на работу раней вызначанага тэрміну выплата дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў праводзіцца да дня дасягнення малым трох гадоў уключна. Гэта вызначана Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Так што пры выхадзе работніцы на працу дапамога не знікае, можа толькі змяніцца яе велічыня. Так, дапамога назначаецца і выплачваецца ў памеры 50 % ад яе поўнай колькасці, у тым ліку калі асоба, якая ажыццяўляе догляд за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў, працуе на ўмовах поўнага рабочага часу, няпоўнага рабочага часу (больш за палову месячнай нормы рабочага часу) у аднаго або некалькіх наймальнікаў.

Пры ўзнікненні абставін, якія ўплываюць на памер назначанай дапамогі, яе велічыня мяняецца з першага дня месяца, які ідзе следам за месяцам узнікнення такіх абставін.

Памер дапамогі не пераглядаецца, калі абставіны, якія ўплываюць на яе велічыню, заканчваюцца ў месяцы іх узнікнення. Гэта вызначана Палажэннем аб парадку прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2013 года № 569 «Аб мерах па рэалізацыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы.

ЗРАЗУМЕЦЬ І ДАРАВАЦЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Чаму ж тады распаўсюджаны такія метады выхавання?

— Гэтыя метады бацькі выкарыстоўваюць, бо і іх так выхоўвалі. Ёсць такое паняцце, як «куфар спадчыны», які мы нясём усё жыццё. І нават вельмі ўважлівыя бацькі, якія знаходзяцца ў кантакце з дзіцем, у пэўны момант з-за сваёй трывогі не паспяваюць падумаць, як падзейнічаюць тыя ці іншыя метады. Замест гэтага ў іх «на аўтапілоце» спрацоўвае схема, паводле якой дзейнічалі з імі. Але гэта часта працуе ў адваротным кірунку. «Не з'ясі суп, я табе яго за каўнер вылью», — крычыць раззлаваны тата. Магчыма, зараз гэта дзіця і з'есць суп, але падумае, куды яго падзець, калі таты не будзе побач. Таму важна ўсё ж думаць, чаму мы хочам навучыць дзіця. І калі казаць пра выхаванне без пакарання, то я за яго. Трэба адрозніваць пакаранне як адплату і ўстанаўленне межаў. Хто нас карае ў дарослым жыцці? Хто нас ставіць у кут? Ніхто не будзе нам чытаць маралі, як робім гэта мы ў дачыненні да нашых дзяцей. Калі мы рэгулярна спазняемся на работу, нас пазбавяць прэміі, прычым хутчэй за ўсё без усялякіх размоў. Калі ў дачыненні да іншых людзей мы паводзім сябе непрыстойна, напэўна, з намі проста перастануць кантактаваць, але караць нас ніхто не будзе. Таму калі ўспомніць, што мы рыхтуем дзяцей да будучага жыцця, то думаць пра наступствы ад учынкаў куды больш важна. Больш за тое, дзецям вельмі патрэбны межы.

Бацькі часта кажуць, што дзіця «само нарываецца» і пакуль не дастанеш папружку, нічога не дапамагае. А чаму гэта адбываецца? Перш за ўсё нашы дзеці маюць патрэбу ў абароне і абаронцы. Яны ўсведамляюць, што пакуль не вельмі моцныя, і менавіта бацькі — гэта тыя, хто можа іх абараніць. Уявіце, што мы ідзём па краі бездані і ведаем, што прывязаны вяроўкай, якая нас трымае і страхуе. Мы ўпэўнена сябе адчуваем. Калі падышлі да краю і адчулі, што вяроўка не трымае, пачынаем хвалявацца. І каб праверыць, нацягваем яе. Так робяць і нашы дзеці. Ім трэба адчуць, што іх трымаюць. Гэта вельмі добра адсочваецца ў падлеткаў: яны падыходзяць да краю, і ім важна, каб дарослы сказаў: стоп! І самае галоўнае, ім важна адчуць, што ў дарослых ёсць сілы іх спыніць. А часам бацькі губляюцца, прычым пачынаючы з ранняга ўзросту. Маці кажа: нельга, а дзіця працягвае рабіць тое, што яно рабіла. Калі вы ўжо выкарысталі слова «нельга», значыць павінны спыніць дзіця. Дарэчы, «нельга» вельмі моцнае слова, з ім варта абыходзіцца асцярожна. Вы сказалі дзіцяці, што нельга есці цукеркі, а яно з'ела і атрымала задавальненне. Затым вы кажаце, што нельга выбягаць на дарогу — і яно ўжо не ўспрымае гэта слова.

Па зялёнай і чырвонай межах

— Як варта ўстанаўліваць межы і ў якіх выпадках?

— Уводзіць у жыццё дзяцей правілы, якія вакол нас існуюць. Межы — гэта ўсё ж не пра пакаранне, а пра дысцыпліну, якая з лацінскай перакладаецца як навучанне. Нам варта навучыць дзіця, што ў жыцці ёсць правілы і межы. І мы ўсе вымушаныя іх прытрымлівацца, каб нам самім было камфортна. Мне вельмі падабаюцца зоны дысцыпліны ў папулярных у бацькоў кнігах прафесара Юліі Гіпенрэйтэр. Ёсць чырвоныя зоны — гэта межы, якія нельга пераходзіць ні ў якім выпадку. Відавочна, што гэта нешта, звязанае з бяспекай. Лепш, калі чырвонай зоны будзе няшмат. Зразумела, малое мы ніколі не выпусцім на дарогу. Калі ваша дзіця выскачыла на дарогу, а вы яго раней папярэджвалі, што нельга, то даць плескача яму, напэўна, давядзецца. Але варта шчыра сабе прызнацца, што гэта не выхаваўчая методыка. Такім чынам мы здымаем уласнае напружанне, бо самі дзіця не ўтрымалі.

Зялёная зона — гэта, зразумела, усё тое, што дзіцяці можна. Чым шырэйшая гэта зона, тым лепш. Калі дзеці адчуваюць павагу да іх пачуцця свабоды і самастойнасці, яны лягчэй прымаюць бацькоўскія абмежаванні. Ёсць жоўтая зона: можна, але з пэўнымі ўмовамі. Ты можаш гуляць у сваім двары, тут бяспечна, а ў суседні ты пайсці не можаш. Можна маляваць у альбоме, а на шпалерах нельга. Гэтых умоў дастаткова шмат, і іх трэба абмяркоўваць з дзіцем, і яно кожны раз правярае межы. Але тут не жорсткія ўмовы: у пэўным узросце ўжо можна і са двара выйсці, і зоны паступова пашыраюцца. І бацькі павінны задумвацца, што, магчыма, дзіця гатовае за пэўныя межы выходзіць. Ёсць аранжавая зона: такія дзеянні дзіцяці, якія з прычыны асаблівых абставін разава дапускаюцца. Напрыклад, мы звычайна ўкладваемся спаць да 10 гадзін, але сёння тата вернецца з доўгай камандзіроўкі і яму хочацца пабачыць дзяцей, і мы ім дазваляем легчы пазней. І калі бацькі дзецям правілы тлумачаць менавіта такой простай мовай, гэта добра ўспрымаецца. Бацькі часта грашаць тым, што шмат размаўляюць, складана тлумачаць законы. А дзіця іх не выконвае, бо не разумее. Яно ўключае «рэжым спаму» і адключаецца.

«Любоў не трэба заслугоўваць, мы дастойныя яе проста таму, што мы ёсць у гэтым свеце. І гэта вельмі важна трансліраваць дзецям, асабліва ў падлеткавым узросце».

— Ці павінна дзіця нешта заслугоўваць? Неяк я назірала на адпачынку матулю, якая на любую просьбу дачкі — купіць марожанае ці узяць планшэт — адказвала: ты не заслужыла...

— Няма сумненняў, што гэта мама нясе груз шматлікіх пакаленняў і яе выхоўвалі гэтак жа. Хоць асноўная патрэба дзіцяці якраз большая, чым планшэт і марожанае — гэта патрэба ў прыняцці, у адчуванні, што я дастойны любові і падарункаў. Дзеці — наша люстэрка, і такая мама рызыкуе аднойчы на сваю просьбу пачуць ад дачкі: «А чым ты гэта заслужыла?» І патрэбу ў безумоўнай любові і прыняцці даюць менавіта бацькі. Любоў не трэба заслугоўваць, мы дастойныя яе проста таму, што мы ёсць у гэтым свеце. І гэта вельмі важна трансліраваць дзецям, асабліва ў падлеткавым узросце, калі здараюцца крызісы, няўпэўненасць у сабе. Любоўю дзіця немагчыма сапсаваць, яе не бывае зашмат, але гэта не азначае ўсёдазволенасці. Сапраўдная любоў да дзіцяці і ў тым, каб паставіць перад ім выразныя межы дазволенага. Зразумела, што немагчыма ўсе просьбы задаволіць. Але трэба мець некалькі спосабаў рэакцый, калі дзіця патрабуе немагчымага, тым самым мы вучым яго быць гнуткім. Мы не спяшаемся сказаць «не», а шукаем, як гэту патрэбу задаволіць па-іншаму. Нельга маляваць на шпалерах, але можна дзесьці ў іншым месцы, напрыклад, на прымацаванай на шпалеры паперы.

Што датычыцца заахвочвання, то часам бацькі плацяць за добрыя адзнакі. Зараз шмат кажуць аб матывацыі, асабліва матэрыяльнай. Тым часам ёсць шмат даследаванняў, асабліва наконт таго, што датычыцца інтэлектуальнай дзейнасці. Дзвюм групам людзей прапануюць рашаць задачкі. Адной групе кажуць, што заплацяць грошы, а другая робіць тое ж самае за дзякуй. А потым ім прапануюць прыйсці парашаць такія ж задачкі назаўтра. Як думаеце, хто пагаджаецца прыйсці заўтра? Зусім не тыя, каму заплацілі, хоць гэта здаецца больш лагічным. Той, хто працуе на інтарэсе, можа і яшчэ раз прыйсці. Калі ж нам заплацілі, мы гэта пачынаем успрымаць, як цяжкую працу. А пасля яе хочацца адпачыць — навошта прыходзіць на наступны дзень? Эфектыўнасць рашэння ў другой групе зноў жа была вышэйшая.

— Значыць, няправільна абяцаць дзіцяці нешта купіць, калі яно скончыць чвэрць з добрымі адзнакамі? Вучоба будзе ўспрымацца, як цяжкая праца?

— Так. Іншая справа, калі мы рады добрым адзнакам і сапраўды штосьці, пра што дзіця марыла, набываем у падарунак. Але загадзя дамаўляцца не варта, бо тады вучыцца дзіця будзе не для сябе, а для бацькоў. Тут таксама ёсць цікавая гісторыя: калі сталаму чалавеку надакучылі дзеці, якія гулялі ў футбол у яго пад вокнамі. І як ён іх ні ўгаворваў пагуляць у іншым месцы, яны не пагаджаліся. І тады ён сказаў: мне так падабаецца, як вы гуляеце, што я гатовы плаціць вам за кожную гульню 10 долараў. Дзеці радасна пагадзіліся. Праз тыдзень ён сказаў, што ў яго няма столькі грошай і цяпер ён будзе плаціць толькі пяць долараў. Дзеці сталі прыходзіць радзей. Калі яшчэ праз нейкі час ён выйшаў і сказаў, што грошы скончыліся, і спытаў, ці не маглі б яны гуляць бясплатна, дзеці адказалі: знайшоў дурняў, ні ў якім разе! І сышлі. Больш за тое, нават сачылі, каб ён не бачыў, дзе яны гуляюць... Нават дарослым, калі ім пачынаюць плаціць за хобі, яно становіцца не такім цікавым.

У вайне пераможцаў не будзе

— Давайце вернемся да пакарання. Пасварыцца на дзіця — гэта пакаранне?

— Часам дзеці кажуць, што лепш бы мяне ў кут паставілі, чым сварыліся. За што можна сварыцца на дзіця?

— Напрыклад, за непрыбраныя рэчы і беспарадак у пакоі.

— Мы не можам змяніць дзіця, але можам змяніць яго паводзіны. Наша задача — навучыць яго, каб яно прыбірала свае рэчы. Ад таго, што вы крычыце, калі яны не прыбраныя, нічога не мяняецца, вы толькі выражаеце свае эмоцыі. Так, ёсць дзеці, якім не хочацца крыўдзіць маму, і, магчыма, наступны раз яны прыбяруць. Іншае дзіця можа падпарадкавацца з-за страху. Але як толькі ўзнікне магчымасць пазбегнуць пакарання, яно гэтага рабіць не будзе. Калі яно прыбірае з-за страху ці пад прымусам, як бы вы яго ні кантралявалі, яно будзе імкнуцца прыкласціся як мага менш. Яшчэ бывае, што дзіця старалася і прыбірала, але не зусім добра гэта зрабіла, і на яго зноў насварыліся, і ў дзіцяці жаданне знікае. Трэба прызнаць, што большасць бацькоў не лічыць крык эфектыўным метадам выхавання. Яны і рады, заклікаючы дзіця да парадку, паводзіць сябе ласкава і цярпліва, але, калі даходзіць да справы, назапашаныя стомленасць і гнеў бяруць верх. Калі мы хочам паўплываць на паводзіны, важна ўстанавіць кантакт з дзіцем, а на піку эмоцый гэта зрабіць складана. Таму лепш узяць паўзу. Выхоўваць мы можам пазней, калі пачуцці ўлягуцца і адносіны адновяцца.

— З нашай гутаркі вынікае, што, прымяняючы пакаранне і сілу, мы наадварот дэманструем уласную слабасць і бездапаможнасць...

— Гэта так. Некаторыя бацькі чамусьці ўпэўненыя, што выхоўваць трэба такім чынам, каб дзіця адчувала, што за кожны дрэнны ўчынак наступіць расплата. І ў гэтай сістэме ім важна заўсёды паспець пакараць. Атрымліваюцца такія адносіны злога следчага і злачынцы. Насамрэч мы заўсёды павінны быць на баку дзіцяці. Прымусіць яго раз і назаўсёды добра есці ці якасна рабіць урокі мы не зможам. І калі мы пачынаем з ім ваяваць, варта ўсведамляць, што пераможцаў у гэтых баявых дзеяннях дакладна не будзе. Мы заўсёды побач з нашымі дзецьмі, нават калі яны не падпарадкоўваюцца. І межы мы павінны ўстанаўліваць таму, што для дзіцяці штосьці шкодна і яно ў сілу ўзросту не можа прадбачыць наступствы сваіх учынкаў, а не таму, што мы мацнейшыя.

«Важна ўсё ж думаць, чаму мы хочам навучыць дзіця. І калі казаць пра выхаванне без пакарання, то я за яго».

Бацькам няпроста, яны часта чуюць супярэчлівыя пасланні ад соцыуму. З аднаго боку, яны павінны любіць, быць цярплівымі і добрымі. З іншага, дзіця не павінна прычыняць нікому турботы. Важна гэтыя пасланні распазнаваць і нагадваць сабе, што мы і нашы дзеці не можам адпавядаць чаканням навакольных і быць ідэальнымі. Карысна ставіцца да сябе больш спачувальна, не прытрымлівацца жорсткіх рэцэптаў, а адштурхоўвацца ад сітуацыі. Тады можна адчуць сябе больш камфортна ў бацькоўстве.

Сёння шмат даследаванняў пра ранні траўматычны вопыт у дзіцяча-бацькоўскіх адносінах і яго ўплыў на будучае жыццё. І бацькі пачынаюць трывожыцца, што дзесьці сарваліся, далі плескача. Часам мамам здаецца, што цяпер жыццё дзіцяці пойдзе наўскасяк. Але калі прывязанасць сфарміравана, калі малое адчувае, што яго любяць, гэта таксама не самы дрэнны вопыт. Дзіцяці трэба бачыць, што бацькі таксама людзі са сваімі жаданнямі і пачуццямі, менавіта ў іх яны вучацца спосабам праяўлення розных эмоцый. Карысна прызнаць, што мы і нашы дзеці, на шчасце, не робаты: у нас няма кнопкі для кіравання, і гэта робіць жыццё цікавым, непрадказальным і радасным.

Алена КРАВЕЦ.

Нататкі шматдзетнага таткі

Учарашнія катлеты — настаўнікам

Купіў днямі кніжку «Лірыка Сярэбранага веку». Ляжу, чытаю Ясеніна з Мандэльштамам. Міма праходзіць сын:

— Калі гэта быў Сярэбраны век?

— У сэнсе?

— Ну спачатку ж быў каменны век, потым жалезны.

— А гэта. Дык адразу пасля бронзавага.

— Да нашай эры?

— Ну так, да нашай з табой эры.

P. S. Хай дзіця думае, што тата на сон чытае зборнік наскальнай паэзіі. Глядзіш, і паважаць пачне.

* * *

Званок на мабільны:

— Добры дзень! Колькі каштуе кранштэйн для нумарнога знака?

— Якая машына?'

— Аўдзі Б4.

— Ужо прададзена.

— Прабачце.

Можна было б яму сказаць, што ён не туды трапіў, але тады б давялося адказваць яшчэ на кучу пытанняў.

* * *

Сын учора прыйшоў з трэніроўкі:

— Тата, у нас сёння было дзесяць раўндаў вольнага бою, з іх два з чэмпіёнам Беларусі.

Паглядзеў на яго непабіты твар і кажу:

— Нешта па табе незаўважна, што ты з чэмпіёнам спарынгаваў.

— Дык ён акуратна працаваў.

А сёння ранкам выходзіць з пакоя ў майцы. Гляджу: а ў яго ўсё плячо ў ранках.

Кажу:

— Ну вось цяпер бачу, што ты ўчора спарынгаваў.

Сын:

— Ды не, гэта мы ранкам з Мартай пабіліся.

— З якой прычыны?

— Каму першым у ванну ісці.

Ну не вучаць у тайскім боксе, як абараняцца ад пазногцяў сястры.

P. S. Трэба папрасіць яе наступны раз надзяваць пальчаткі — каб хоць крыху зраўняць шанцы.

* * *

Дзеці ўбачылі па тэлеку кабрыялет. Вера нахмурылася:

— Што гэта?

— Машына.

— А чаму без даху?

— Каб летам ездзіць.

Вера абурана:

— Гэта што, для зімы яшчэ адна патрэбна?!

Практычнасць — наш канёк.

* * *

— Тата, а «параход» так называецца таму, што ён на пораху працуе?

— Так.

— А «паравоз»?

— Таксама.

— Абалдзець.

Сам у шоку.

* * *

Малодшыя расказалі: абедалі сёння ў школе, на раздачы абедаў стаяла маладая дзяўчына-кухар. Калі дайшла іх чарга, кухар адкрыла каструлю, каб пакласці ім катлету. І тут раптам іншая жанчына, старэйшая, таксама, як я зразумеў, кухар, сказала ёй: «Закрой, гэта для настаўнікаў, для дзяцей у іншай каструлі».

І вось у дзяцей узнікае слушнае пытанне: якая розніца, з якой каструлі даваць дзецям катлеты?

Ну што я, як сапраўдны патрыёт Беларусі і школьнага харчавання ў прыватнасці, мог адказаць? Вядома, што катлеты для дзяцей нашмат больш смачныя, а настаўнікам пакідаюць тое, што дзеці не даелі ўчора.

(Толькі не кажыце мне, што я вучу дзяцей хлусіць. Я цалкам шчыра ў гэта веру.)

Гэта была рубрыка «ўсё найлепшае — дзецям».

P. S. Адзіная праблема — як навучыць кошку браць талончык?

Павел ХОЛАД.

БЕЗ ЛІШНІХ СЛОЎ

Прыгожую прычоску і макіяж можна зрабіць і без гукавой камунікацыі

У Беларусі інваліды з парушэннем слыху з трох з паловай тысяч прафесій могуць засвоіць толькі сотню. Гэта рашэнне медыцынскай рэабілітацыйнай экспертнай камісіі. На справе ж патэнцыял глухіх людзей значна шырэйшы. Доказ таму — «Адукацыя без перашкод» Гомельскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» у межах міжнароднай ініцыятывы «Вучыцца, каб дзейнічаць».

Сутнасць унікальнага праекта — навучыць жанчын, у якіх ёсць праблемы са слыхам, цырульнай справе і мастацтву макіяжу. Да ўдзелу запрасілі вельмі розных гамяльчанак: ад учарашніх школьніц і маладых матуль да рабочых завода.

— Аб'яднала ўсіх адно — жаданне атрымаць новыя навыкі і, канешне, імкненне да прыгожага. Якая жанчына не марыць выглядаць на ўсе сто? — падзялілася **кіраўнік Гомельскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» і куратар праекта Галіна ПАШЭД**.

Па словах жанчыны, ідэю правесці такі курс падказала само жыццё. Галіна Міхайлаўна не раз запускала грамадскія ініцыятывы па падтрымцы інвалідаў, а летась была арганізатарам міжнароднага фестывалю прыгажосці «Залатая пралеска». Адно да другога — вось вам і новы праект.

Самыя цярплівыя мадэлі — мамы, сёстры, дзеці

Цікава, што некаторыя з удзельніц да старту ўжо мелі пэўны досвед у б'юці-сферы. Хтосьці стрыг дамашніх, хтосьці рабіў макіяжы сяброўкам. Многія былі б і рады запісацца на платныя курсы, але вучыць інвалідаў сёння мала хто адважваецца. Дзяўчатам сапраўды пашчасціла, што ў Гомелі знайшліся неабыякавыя людзі і запусцілі такі праект.

— У нашай краіне шмат увагі аддаецца інклюзіўнай адукацыі для дзяцей і моладзі, гэта цудоўна. Чаго нельга сказаць пра адукацыю для дарослых. Цяпер ва ўсім свеце пануе тэндэнцыя зменлівасці: адны прафесіі хутка губляюць запатрабаванасць, а іншыя набываюць. Таму кожны павінен быць гнуткім, імкнуцца да засвойвання новых ведаў і навыкаў. Аднак людзі з пэўнымі праблемамі здароўя пакуль не маюць такой магчымасці, — кажа **Галіна ВЕРАМЕЙЧЫК, кіраўнік прадстаўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў.** — Праект «Адукацыя без перашкод» якраз адносіцца да нефармальнай адукацыі для ўсіх. Чым больш будзе такіх ініцыятыў, тым хутчэй мы ўбачым змены ў гэтым кірунку на заканадаўчым узроўні і тым больш людзей зможа змяніць сваё жыццё ў лепшы бок.

Дарэчы, «Адукацыя без перашкод» закранула лёсы не толькі саміх удзельніц, але і іх сем'і. Мамы, сёстры, дзеці, мужы былі самымі цярплівымі мадэлямі і ў той жа момант самымі строгімі крытыкамі. За пяць месяцаў усе прызвычаіліся адзін да аднаго, пасябравалі.

— Калі мяне запрашалі ў праект, папярэджвалі: «Будзе складана». А на справе аказалася наадварот. Такія зацікаўленыя, апантаныя вучаніцы сустракаюцца нячаста. Ні на імгненне не адрываючы вачэй, сочаць за кожным рухам тваёй рукі, на эмацыянальным узроўні спрабуюць зразумець, чаго ты ад іх чакаеш, — дзеліцца ўражаннямі **выкладчык курса па макіяжы Вольга ЦІМАШЭНКА**. — Візажыст — якраз адна з тых прафесій, дзе можна абысціся і без гукавой камунікацыі. Кліент прыходзіць не паразмаўляць, а атрымаць канкрэтную паслугу. Тут добрае партфоліа гаворыць само за сябе.

Ірына МАШЭЧКА, якая вучыла ўдзельніц сакрэтам цырульніцкай справы, прызналася, што заняткі маглі доўжыцца да пяці гадзін без перапынкаў. За кароткі тэрмін (сустракаліся толькі два разы на тыдзень) дзяўчаты прайшлі поўны курс: ад правілаў дэзынфекцыі інструментаў да складаных вячэрніх укладак і афарбовак. Па словах Ірыны, яе вучаніцы могуць хоць заўтра выходзіць на работу ў любы салон горада.

— Працую майстрам на вытворчасці, але ў душы заўсёды была цырульнікам — даўно сама стрыгу сына. Яму падабаецца, і я не раз задумвалася аб змене прафесіі, але баялася, што з-за праблем са слыхам гэта немагчыма, — расказвае **Ірына ЗУБАРАВА**. — Праект даў магчымасць зірнуць на сітуацыю па-іншаму. Паспрабаваць свае сілы ў рэальных салонах, папрацаваць пад наглядам прафесіяналаў, паспаборнічаць з майстрамі-пачаткоўцамі.

Пакуль Ірына гаворыць са мной, назіраю цікавую карціну: астатнія дзяўчаты ў зале таксама адарваліся ад сваіх спраў. Дзясятак пар вачэй уважліва сочыць за рукамі Іры — усім цікава «паслухаць», пра што ідзе гаворка. Здаецца дробязь, але яна падкрэслівае важную рысу майстроў з інваліднасцю па слыху — яны людзі засяроджаныя. Немагчыма ўявіць, як дзяўчаты ў час работы балбочуць з калегамі аб сваім. Прыйшоў кліент — і іх увага цалкам прыкаваная да яго валасоў ці твару. Значыць адсутнічае рызыка, што, загаварыўшыся, яны адрэжуць лішнія некалькі сантыметраў валасоў. Вось вам і важкая прычына сесці ў крэсла менавіта да «ціхага» майстра, а не да яго гаваркіх калег.

Сёння свята ў дзяўчат

Спрытныя жаночыя рукі хутка накручваюць валасы на плойкі, упэўнена трымаюць у руках машынкі для стрыжкі, праводзяць раўнюткія тонкія лініі на павеках і вуснах. У паветры пах лаку для валасоў змешаны з хваляваннем. Нягледзячы на тое што адукацыя ў межах праекта нефармальная і дыпломаў дзяўчаты не атрымалі, экзамен ніхто не адмяняў. Але ніякіх адзнак. Выпускныя іспыты вырашылі правесці ў форме конкурсу прафесійнага майстэрства.

Мужчынская стрыжка, жаночая вячэрняя прычоска, макіяж — у кожнай з удзельніц была магчымасць паказаць свае здольнасці з найлепшага боку ў тым кірунку, які ёй больш даспадобы. Права быць мадэллю ў дзяўчат заслужылі самыя блізкія — іх сяброўкі, сёстры і браты, мужы.

На выніковую работу строгае журы дало ўсяго гадзіну. Шум фена, стракатанне нажніц і аніводнага слова — у зале стаяла поўная цішыня...

Паглядзець на работы выпускніц незвычайнага праекта сабралася шмат народу. Дзеля іх зладзілі сапраўднае дэфіле: мадэлі прайшліся па гомельскім Цэнтры інклюзіўнай культуры і скарылі не толькі гледачоў, але і сэрцы журы. Найлепшымі майстрыхамі прызналі Лідзію Градовіч (жаночая прычоска), Ліяну Крэчатаву (мужчынская стрыжка) і Святлану Феафілаву (макіяж).

Пасля балю

З вокладкі буклета, які падрыхтавалі па слядах праекта, позіркам прафесійнай мадэлі глядзіць зеленавокая дзяўчына. У позірку нешта чапляе. Гэта **Вера АБРАМАВА** — адна з удзельніц, якой вучоба далася ўдвая складаней, чым астатнім. У яе ДЦП. Аднак, нягледзячы на гэта, Вера нараўне з астатнімі дзяўчатамі вучылася ўкладваць валасы і рабіць макіяжы. Рукі хоць і не слухаліся, але не апускаліся. З дапамогай сям'і і іншых удзельніц Вера дайшла да фіналу.

Праект скончыўся, але ўсіх хвалюе пытанне: што далей? Ці ёсць у дзяўчат шанц уладкавацца на работу ў салон? Або свае веды і навыкі яны змогуць скарыстаць толькі «для сябе».

— З працаўладкаваннем у салоны сапраўды могуць узнікнуць праблемы. Не таму што такім майстрам не рады найманьнікі, а таму што яны не змогуць прайсці медкамісію. Існуючыя стандарты не гнуткія, для таго каб іх змяніць, патрэбен час, — кажа **дырэктар ААТ «Локан» Ларыса КІРЫЧЭНКА.** — З іншага боку, сёння ў Беларусі актыўна развіваецца такі кірунак дзейнасці, як самазанятасць. Ніхто не забараняе пачаць напрацоўваць кліентуру дома. Першым часам гэта будуць знаёмыя, але ў нашай прафесіі найлепшая рэклама — «сарафаннае радыё». Не дарма ў межах праекта дзяўчат знаёмілі з азамі прадпрымальніцкай дзейнасці.

— Працаўладкаванне для такіх людзей па-ранейшаму застаецца праблемай. У нашай краіне няма сярэдніх спецыяльных, вышэйшых устаноў адукацыі для тых, у каго праблемы са слыхам. Кола прафесій, да якіх іх дапускаюць, абмежаванае. Швачкі, токары, слесары — у асноўным гэта рабочыя спецыяльнасці, якія пакрысе страчваюць актуальнасць. А праект «Адукацыя без перашкод» даў дзяўчатам магчымасць паспрабаваць свае сілы ў рэальна запатрабаваных сёння прафесіях. Факт: усе хочуць быць прыгожымі! — разважае **дырэктар Цэнтра інклюзіўнай культуры горада Гомеля Кірыл КУРДЗЮМАЎ**. — Пры гэтым цікавасць да нефармальнай адукацыі дарослых інвалідаў сёння надзвычай вялікая. Работадаўцы гатовы не толькі аддаць вакансію людзям з абмежаванымі магчымасцямі, але і навучыць іх новым навыкам. Добры прыклад — «ціхія» касы, якія з'явіліся летась у сталічных крамах. Наймальнік сам рыхтаваў для сябе спецыялістаў. А выпускніцы нашага праекта ўжо гатовы да выхаду на работу: яны засвоілі не толькі новую прафесію, але і навучыліся працаваць у салонах горада падчас практычных заняткаў.

Ганна КУРАК.

«ГАЛАВА? А ЧАМУ ЯНА ПАВІННА БАЛЕЦЬ?!»

КОЖНЫ РАЗ ПРАЖЫЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Для суботняй сустрэчы абралі папулярнае гродзенскае кафэ, дзе заўсёды шматлюдна і смачна (відаць, і народу — натоўп, таму што заўсёды можна нечым паласавацца). На парозе з'яўляецца Нінель (нягледзячы на розніцу ва ўзросце, я не называю яе імя па бацьку — так больш натуральна) у скуранай спадніцы ніжэй за калена, такой жа скуранай куртцы, як заўсёды, на абцасах і з нязменнай царскай хадою. Па дарозе хапае некалькі зацікаўленых мужчынскіх позіркаў і сядае за столік, што знаходзіцца далекавата ад цэнтра, дзе можна стварыць крыху кулуарную атмасферу, так проста пабалбатаць аб сваім, дзявочым...

— Ну і куды вы гэтым разам даехалі, пакуль мы не бачыліся? — пытаюся адразу.

— Свае 72 гады сустрэла ў лютым на Паўднёвым Гаа, а ў верасні была на Сіцыліі, — з загадкавай усмешкай (відаць, што адразу ёй прыгадваецца нешта дзівоснае) адказвае Нінель.

І вось тут варта распачаць гісторыю яе вандровак: за 30 гадоў яна наведала амаль 30 краін свету. Дзе толькі ні была! І ў горы на вышыню без малога тры тысячы метраў падымалася, і з аквалангам у акіянскія воды ныряла, у горадзе кахання і рамантыкі — Парыжы — загадвала самыя патаемныя жаданні... Павандравала па Еўропе, пабывала на Блізкім Усходзе, у Афрыцы, Паўночнай Амерыцы. У апошнія гады яе больш вабяць экзатычныя краіны: Туніс, Мальдывы, Дамінікана, Індыя...

На пытанне: «Якія з кантынентаў назапашаны для візітаў у будучыні?» — адказала, што марыць злётаць у Японію і Аўстралію.

На думку маёй суразмоўніцы, лепш за вандроўкі нішто не вылечвае ад сезоннай хандры:

— Для мяне паехаць у іншае месца — гэта быццам пражыць новае жыццё, якое напаўняе свежымі эмоцыямі, моцнымі ўражаннямі, узмацняе жаданне дзейнічаць і ствараць лепшае!

ЗДЗЕЙСНІЦЬ МАРУ НА... ПЕНСІЮ?

Цяпер галоўнае пытанне: фінансавае (куды ж без яго?!):

— Ці магчыма пенсіянеру ездзіць па свеце?

— Канешне! Галоўнае, разлічыць усе свае выдаткі. Я, напрыклад, атрымліваю пенсію і працую. Мы з мужам прызвычаіліся весці аскетычны лад жыцця: есці няшмат, не купляць пра запас. З дзяцінства мяне бабуля навучыла, што трэба эканоміць. Пенсіянеру ж неабавязкова рабіць манікюр-педыкюр у салоне, купляць новае адзенне, карацей, разлічвацца за тыя рэчы, якія цягнуць шмат сродкаў у маладых. А яшчэ я падлічыла: штомесяц выдаткоўваю сабе на ежу не больш за 100 рублёў.

— ???

— Не верыце? Я не купляю кілаграмы агародніны, што робяць большай часткай пенсіянеры, калі трапляюць на рынак. Я жыву побач і бачу, з якімі торбамі яны вяртаюцца дамоў. А да маіх двух-трох агуркоў тутэйшыя гандляры ўжо прызвычаіліся, — усміхаецца жанчына.

Вось так і атрымліваецца, што за год можна назапасіць пэўную суму, каб здзейсніць сваю мару пра экзатычны адпачынак.

Дарэчы, з паездкай на Мальдывы абдылася цікавая гісторыя: мая візаві аднойчы вырашыла: калі вядомая Анастасія Валачкова там была, чаму я не магу? Так і здарылася, а яшчэ яна паўтарыла знакаміты шпагат балерыны на пляжы... Нездарма ж калісьці таксама вельмі сур'езна займалася балетам.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Дарэчы, цікава наогул, чым харчуецца фітнес-трэнер і чаму навучае іншых? Мая суразмоўніца расказвае, што на працягу чатырох гадоў нават практыкавала вегетарыянства, але калі з'явіліся праблемы са здароўем, ад ідэі не есці мяса зусім яна адмовілася:

Лот № 14. Кап. строение с инв. № 200/С-96997 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/18, пл. – 1492,2 кв. м; наименование: теплопункт; 1/10 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97125 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, отстойник вблизи здания № 42/20, наименование: отстойник; наружной пл. – 74 кв. м; 1/10 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97506 по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, ливневая канализационная сеть, наименование: ливневая канализационная сеть; протяж. – 1 899,4 м; 1/17 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97495 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, водопроводная сеть к зданиям № № 42/1,42/2, 42/3,42/4,42/7, 42/8, 42/13, 42/15, 42/16, 42/18, 42/22, 42/24, 42/26, 42/27, 42/29, 42/30, 42г, наименование: водопроводная сеть, протяж. – 2 508,2 м; 1/12 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97511 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, канализационная сеть, наименование: канализационная сеть, протяж. – 2 691,5 м. Нач. цена: 35 472,97 бел. руб. с НДС. Задаток: 3 547,30 бел. руб.

Лот № 16. Кап. строение с инв. № 200/С-96998 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/8, пл. – 498,7 кв. м; наименование: насосная 2-го подъема; кап. строение с инв. № 200/С-96942 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/7, пл. – 69,6 кв. м, наименование: контора хозчасти; кап. строение с инв. № 200/С-97097 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/32, пл. – 2,7 кв. м, наименование: домик для охраны; кап. строение с инв. № 200/С-97128 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/31, пл. – 55,5 кв. м; наименование: насосная 1-го подъема; кап. строение с инв. № 200/С-97118 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, 42/9, наименование: водонапорная башня, пл. – 57 кв. м; кап. строение с инв. № 200/С-97496 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, прожекторная мачта вблизи здания 42/8, наименование: прожекторная мачта, пл. – 1,0 кв. м; кап. строение с инв. № 200/С-97508 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, сеть наружного освещения вблизи зданий № № 42/7,42/8; наименование: сеть наружного освещения, протяж. 275,3 м, 1/17 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97495, по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, водопроводная сеть к зданиям № № 42/1,42/2, 42/3,42/4,42/7, 42/8, 42/13, 42/15, 42/16, 42/18, 42/22, 42/24, 42/26, 42/27, 42/29, 42/30, 42г, наименование: водопроводная сеть, протяж. – 2 508,2 м; 1/12 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97511 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Максима Горького, канализационная сеть, наименование: канализационная сеть, протяж. – 2 691,5 м; 1/13 доля в праве собственности на кап. строение с инв. № 200/С-97512 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, тепловая сеть, наименование: тепловая сеть, протяж. – 1 269,8 м. Нач. цена: 131 466,67 бел. руб. с НДС. Задаток: 13 146,67 бел. руб.

Аукцион состоятся 17.12.2018 в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи заявлений: с 15.11.2018 с 8.30 по 14.12.2018 до 17.30 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Сумма задатка перечисляется на р/с BY60BLBB30120300200516001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, BIC BLBBBY2X, УНП 300200516. Получатель платежа: ОАО «Классика индустрии моды». Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от нач. цены лота. Нач. цена указана с учетом НДС. Капитальные строения расположены на зем. участке с кад. № 240100000003001399, пл. – 9,9940 га, который является неделимым и после продажи недвижимого имущества будет предоставлен в общую долевую аренду. Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Перечни оборудования и передаточных средств, входящих в капитальные строения, опубликованы на сайтах www.bankrot.gov.by, на сайте marketvit.by. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт.тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru

Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221281205101000140, площадью 0,1173 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Поляи, ул. Луговая, У-6, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб.
Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221281201101000536, площадью 0,1495 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Садовая, У-1, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб.
Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221281201101000534, площадью 0,1301 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Садовая, У-2, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона реки, водоема (оз. Полонское). **Нач. цена**: 8 000,00 бел.руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 17.12.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 15.11.2018 с 8.30 по 14.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140200420000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Вороновский сельсовет). Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь)

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
По объекту: «Реконструкция жилого дома № 31 по ул. Я. Мавра с надстройкой мансардного этажа»

Общество с ограниченной ответственностью «Мансарды Столицы» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

Заказчик-Застройщик – ООО «Мансарды Столицы» зарегистрировано Минским горисполкомом, решение от 25 ноября 2014 года, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192382932. Юридический адрес: 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 11, офис 1211.

Режим работы: понедельник – четверг с 9.00 до 17.30, пятница с 9.00 до 17.00, обед с 12.00 до 12.30, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет ООО «Мансарды Столицы» получено решение МГИ от 29 октября 2015 г. на ПИР по объекту «Реконструкция жилого дома № 29, 31, 33 по ул. Я. Мавра с надстройкой мансардного этажа». Жилой дом № 33 по ул. Я. Мавра находится в стадии ввода в эксплуатацию.

Функции заказчика осуществляются собственными силами.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – реализация проекта по договору № ЯМ-31 от 11 марта 2015 г. на реализацию права проектирования и реконструкции жилого дома № 31 по ул. Я. Мавра с надстройкой мансардного этажа с УП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска».

Объект долевого строительства – надстройка мансардного этажа с квартирами типовых потребительских качеств общей площадью 1081,42 кв. м. Нормативная продолжительность строительства – 13,5 мес. Проект реконструкции жилого дома с надстройкой мансардного этажа разработан с учетом проекта капитального ремонта жилого дома. Все архитектурные, конструктивные и инженерные решения увязаны для всего сооружения в целом.

Реконструкция осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – 1-й квартал 2018 года.

Окончание строительства – 1-й квартал 2019 г.

Месторасположение объекта – Фрунзенский район г. Минска, ул. Я. Мавра, дом № 31.

Состав общего имущества: межквартирные лестничные клетки, лестницы, крыши, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.

Для привлечения физических лиц и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 г. № 263, по состоянию на дату опубликования проектной декларации, предлагается 24 (двадцать четыре) квартиры, в т. ч.:

– двухкомнатные – общей площадью 39,53; 40,39; 42,12; 43,53 кв. м – 6 квартир;

– трехкомнатные – общей площадью 57,59 кв. м – 1 квартира.

Стоимость строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: 2-комн. – 2310 белорусских рублей 00 копеек за 1 кв. м, что эквивалентно 1100 долларов США; 3-комн. – 2310 белорусских рублей 00 копеек за 1 кв. м, что эквивалентно 1100 долларов США. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства. Оплата взносов в долевое строительство производится по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Отделка квартир не выполняется.

Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 кв. м общей площади квартир и их количество считается действительной до момента опубликования новой проектной декларации.

Застройщиком получены:

– заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 2-208А-005/18 от 18.01.2018;

– решение МГИ от 29 октября 2015 г. № 2930 о разрешении строительства.

Сведения о договорах подряда:

договор строительного подряда от 11.12.2017 г. № ЯМ-31/17, заключенный с ЧСУП «БелоирСтрой».

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 11, офис 1211, тел./факс (017) 360-61-86, 8 (029) 329-05-09.

Музыка ў яе душы

Нішто не прадракала бяды. Стабільнасць была дома і на рабоце. І раптам жыццё перавярнулася. Без усялякіх папярэджванняў, без намёкаў на тое, што зладжаная сістэма раптам дасць збой. Глеба выслізнула з-пад ног — як тады, дваццаць гадоў назад, калі Яня выходзіла з машыны, што спынілася насупраць бацькоўскага дома, за шыбамі якога замест яркага святла трапятаўся язычок свечачкі. Яе, цяжарную, падхапілі, занеслі ў пакой, дзе ў труне апошняга «прабач-бывай» чакала маці. Стрэс быў такі моцны, жалоба такая глыбокая, што той, каго яна насіла пад сэрцам не вытрымаў душэўнага болю...

...Цяпер яна сама задыхалася ад роспачы, кідалася ў розныя бакі, прадчуваючы непапраўнае, рвала на сабе валасы: як жа так, як не дагледзела, не адчула, чаму яе мацярынскі інстынкт маўчаў?

Ах, гэта спрадвечная мацярынская звычка — ва ўсім вінаваціць найперш сябе! Дзеці, пакуль не стануць самі бацькамі, нават уявіць не могуць, што, аберагаючы матуль ад хваляванняў і хаваючы праўду, толькі яшчэ больш шкоды прыносяць. Муж Мар'ян, хоць і сам учарнеў ад невядомасці, але супакойваў Яніну, абнадзейваў. Ды хіба можна супакоіць чулае мацярынскае сэрца? Яе вуліца з прыгожай назвай Сонечная ўмомант ператварылася ў змрочнае безаблічнае сутарэнне, якім ёй трэ было ісці на працу, а ногі неслі некуды ў іншы бок, вочы шукалі абнадзейлівага знаку. Тыя дні жанчына жыла толькі малітвамі. І Бог вярнуў ёй малодшага сына. Руслан знайшоўся гэтак жа нечакана, як і прапаў.

Як часта на адлегласці часу многія здарэнні ўспрымаюцца намі зусім без трагічных прыўкрас, іншы раз нават з гумарам. А тады было не да смеху. Сацыяльны педагог Сыраваткінскай школы Яніна Пашук, якая шмат гадоў запар была «наглядчыцай» за сем'ямі сацыяльна небяспечнымі, а як дэпутат сельсавета мусіла ведаць і надзённыя праблемы свайго электарату, раптам усвядоміла, што самае галоўнае ў жыцці — уласная сям'я. Як чалавек шчыра веруючы, яна не ўкленчвала да Госпада «За што?». Імкнулася зразумець — ДЛЯ ЧАГО?

Па-настаўніцку прыдзірліва, ажно да прадузятасці, аналізавала кожны свой крок. Успамінала педагагічныя метады сваіх бацькоў. Якія там метады?! У мнагадзетнай сям'і, дзе гадаваліся тры сястры і два браты, само сялянскае жыццё выхоўвала і загартоўвала. Але ў Ваўкавыскай вёсачцы Талькаўцы ніхто слова дрэннага не сказаў у іх бок. Мала того што працавітыя, сумленныя, добразычлівыя Свістуны былі, дык яшчэ надзвычай таленавітыя, здольныя да музыкі і спеваў. Калі Яня са старэйшым братам заяўляліся ў вясковы клуб, чулася радаснае: «Ого! Будзе весела, бо Свістуны прыйшлі!» Гэта натхняльнае прывітанне суправаджала яе ўсё жыццё. Радаснымі агеньчыкамі ў вачах яе прыход сустракалі і пасля таго, калі сваё дзявочае прозвішча Свістун яна памяняла на Пашук, пабраўшыся шлюбам з працавітым шафёрам, прыгожым гарманістам з Сыраватак Мар'янам. Працуючы ў школах ці ў дзіцячым садку, Яніна большую частку свайго часу аддавала мастацкай самадзейнасці. Цяпер сама здзіўляецца, як хапала здароўя і сілы па чатыры разы на тыдзень ладзіць танцы ў клубе. Ды гэта вам не цяперашнія дыскатэкі! Гучала жывая музыка мясцовага інструментальнага ансамбля, Яня іграла на гітары і на іоніцы, якую хутка замяніў электрааргән.

У такім далёкім 1977 годзе разам з сяброўкай Вацлавай Гіль яны прыехалі на Смаргоншчыну пасля заканчэння Гродзенскага музычна-педагагічнага каледжа. Тады, праўда, ён называўся вучылішчам. Яніна выкладала ў школе вёскі Паляны музыку і спевы, працавала піянерважатай. З Вацлавай, якая працавала ў Жодзішках, яны рэгулярна сустракаліся на рэпетыцыях у Жодзішкаўскім ДК. Праз нейкі час школу зачынілі, а ёй прапанавалі месца выхавальніцы ў дзіцячым садку. Працавала ў Сыраваткінскім клубе. Потым перайшла ў Сыраваткінскую СШ. Гадавала сваіх сыноў і выхоўвала чужых дзяцей, якім іншы раз удзяляла больш увагі, чым сваім... Яніна Чаславаўна не цягнула на сцэну ні Максіма, ні Руслана. Хіба што ў тых выпадках, калі без іх дапамогі нельга было абысціся. Да конкурсаў і аглядаў рыхтавала іншых, сціпла мяркуючы, што сваіх піярыць не вельмі па-хрысціянску. Бянтэжачыся перад матуліным аўтарытэтам, маленькі Максімка пагаджаўся спяваць, толькі схаваўшыся ў шафу. Але ж, нездарма кажуць, што талент у зямлю не закапаеш, тым больш — у шафу не зачыніш. І старэйшы сын пайшоў па матуліных слядах. Хто сёння не ведае таленавітага, адоранага прыгожым голасам і прываблівай знешнасцю смаргонскага спевака і пастаяннага вядучага шматлікіх імпрэз!

Меншы, Руслан, не асмеліўся «канкурыраваць» і абраў свой шлях — закончыў Маладзечанскі політэхнічны каледж. У параўнанні з Максімам ён цішэйшы, спакайнейшы, адным словам — не публічная асоба. Але толькі аднакласнікі ды самыя блізкія людзі ведаюць пра яго вялікае і добрае сэрца. Можа таму, яго інакш, як Руслік, не называюць. Ці не праз сваю празмерную дабрыню і боязь парушыць матулін спакой некалі наіўна вырашыў малодшы сын справіцца сам-насам з сітуацыяй, якую трэба было вырашаць усім разам? Што ж, як кажа Яніна Чаславаўна, усё да лепшага, праз памылкі навука даецца больш грунтоўная...

Ці ведаеце вы найлепшы сродак пазбаўлення ад стрэсу? Насамрэч, гэта творчасць. І не важна, у якой галіне мастацтва ці рамяства праяўляць сваю індывідуальнасць, сваё бачанне, сваё адчуванне прыгажосці. Музыка, спевы дапамагаюць, як нішто іншае, аднавіць гармонію ў душы. А душа, прайшоўшы праз выпрабаванні, іншы раз нараджае сапраўдныя творы мастацтва... Музыка Яніны да школьнага гімна атрымалася шчыра-сонечнай. А крыху пазней мясцовы кампазітар даведалася, што яе сын Максім таксама піша песні — і вершы ды музыку да іх. Не дзеля славы — дзеля душы і ўдзячнасці Таму, хто надзяліў талентам.

Парады бывалых

АБЛЯПІХА ПАД АКНОМ — ЗДАРОЎЕ Ў ХАЦЕ

Калі ў нас засохла гэтае дрэўца, я — шчыра скажу — плакала, так мне шкода было.

Назву яно атрымала таму, што яго плады густа абляпляюць канцы галінак.

Абляпіха шырока распаўсюджана ў многіх краінах, у нас, у Беларусі, яе лепш за ўсё высаджваць на схілах, там, дзе выпадае больш вільгаці. Каб дрэўца вырасла ўраджайным, пры пасадцы трэба паклаці пад карані з вядзерца перагною, дзве-тры сталовыя лыжкі калійна-фосфарнага ўгнаення. І паліваць два разы на тыдзень, пакуль яно не набярэ сілу.

Абляпіха вельмі багатая на аскарбінавую і фоліевую кіслату, на вітаміны. У галінках яе выяўлена высокае ўтрыманне дубільнага рэчыва.

Цвіце абляпіха ў красавіку—маі, плады паспяваюць у верасні—кастрычніку. Іх можна захоўваць у замарожаным выглядзе, гатаваць варэнне, джэмы, сокі, кампоты... Са свежых пладоў гатуюць абляпіхавы алей. Ён садзейнічае загойванню ран, суцішае боль, выкарыстоўваецца ў якасці прафілактычнага сродку пры прамянёвых і іншых пашкоджаннях скуры, апёках, пролежнях і г. д. Іншымі словамі, абляпіха аблягчае і падаўжае жыццё чалавека. А найлепшы тэрмін для яе пасадкі — лістапад.

Вера Сазонава,
г. Мінск.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

ЗАПЯКАНКА З ГАРБУЗА

Спатрэбіцца: *гарбуз — 600 г, тварог (пажадана не кіслы) — 200 г, яйкі — 3 шт., манка — 50 г, цукар — да 100 г (на смак і ў залежнасці ад сорту гарбуза).*

Гарбуз можна надзерці на буйной тарцы або парэзаць на невялікія кавалачкі. Кладзём яго у каструлю, наліваем трохі вады, каб гарбуз не падгарэў, і тушым да мяккага стану пад накрыўкай, з гатовай масы робім гарбузовае пюрэ.

Змешваем тварог, яйкі, манку і цукар. Невялікімі порцыямі дадаём у тварожную масу гарачае гарбузовае пюрэ.

Атрыманую масу выліваем у форму (дыяметрам 22 см) і ставім у духоўку пры 200 °С прыкладна на 20—25 хвілін да ўтварэння прыгожага залацістага колеру.

Чакаем, пакуль запяканка астыне, пасля чаго перакладваем на блюда і падаём да стала.

МАРЫНАВАНАЯ МОЙВА

Спатрэбіцца: *мойва — 500 г, вада — 350 мл, соль — 2 ч. л., цукар — 1 ч. л., лаўровы ліст — 3 шт., гваздзіка — 3 шт., чорны перац — 10 гарошын, зерне гарчыцы — 3 ч. л., воцат 9-працэнтны — 3 ч. л.*

Прыгатаваць марынад: ваду давесці да кіпення, дадаць усе інгрэдыенты, кіпяціць 5 хвілін, астудзіць да пакаёвай тэмпературы.

Рыбу перабраць, памыць. Перакласці ў глыбокую ёмістасць. Заліць марынадам, накрыць і прыняць у халадзільнік на 12 гадзін. Змяшаць змесціва і прыняць яшчэ на суткі. Праз суткі рыба гатовая.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

ТАПАЧКІ

Простая ідэя для аматараў вязання

Тапкі вяжуцца на двух прутках, пачынаючы з падэшвы. Пруткі № 4. Памер тапак 23 см па даўжыні. Шчыльнасць вязання: 20 вочак на 20 радоў — узор 10 х 10 см.

Падэшва:

Набраць 26 вочак.

1 рад: вязаць усе вочкі вонкавымі, у пачатку і ў канцы дадаць па адным вочку (28 вочак).

2 рад: усе вонкавыя вочкі.

3—16 рады: паўтор радоў 1 і 2 (42 вочкі).

17 рад: вязаць вонкавымі, у пачатку і ў канцы рада правязаць 2 вочкі разам вонкавым (40 вочак).

18 рад: усе вонкавыя вочкі.

19—32 рады: паўтор радоў 17 і 18 (26 вочак).

Верх:

33 рад: набраць 8 вочак (вочкі пяткі) і вязаць вонкавымі (34 вочкі).

34 рад: усе вочкі вонкавыя, у канцы дадаць 1 вочка (35 вочак).

35 рад: вонкавыя вочкі.

36—48 рад: паўтор радоў 34 і 35 (42 вочкі).

49 рад: закрыць 24 вочкі, рад скончыць вонкавым (18 вочак).

50 рад: вонкавыя вочкі.

51 рад: адваротныя вочкі.

52—56 рады: паўтор радоў 50 і 51 (18 вочак).

57 рад: набраць 24 вочкі і тыя, што былі вязаць вонкавымі (42 вочкі).

58 рад: вонкавыя вочкі, у канцы правязаць 2 разам вонкавым (41 вочка).

59 рад: вонкавы вочкі.

60—73 рад: паўтор радоў 58 і 59 (34 вочкі).

Сшываем і ўпрыгожваем на свой густ!

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Аўсяная мука супраць плям на замшы

Сальныя плямы, якія нярэдка з'яўляюцца на абутку з замшу, лёгка выдаляюцца з дапамогай аўсянай мукі. Вазьміце крыху мукі і ўтрыце яе ў пляму, пакінуўшы на паўгадзіны. Потым проста пратрыце кавалачкам тканіны.

Наждачная папера супраць слізгацення

Як толькі купілі туфлі з плоскай падэшвай, натрыце іх наждачнай паперай. Такім чынам атрымліваецца абразіўны пласт, які не дасць вам паслізнуцца і зваліцца.

«КАЛІ БОГ ЗЛУЧЫЦЬ, ДЫК НІХТО НЕ РАЗЛУЧЫЦЬ» (Народная прыказка).

ГАЛОЎНЫ ЭКСПАНАТ

Чаму ў «Музеі Вавёркі» ў Вялікай Бераставіцы жыве чылійскі дэгу, а не мясцовы звярок

Вавёрка стала сімвалам Бераставіцы падчас святкавання 500-гадовага юбілею гарадскога пасёлка ў 2006 годзе.

З чым звязана такое пакланенне вавёрцы, невядома. Толькі ў архівах ёсць звесткі аб тым, што ў сярэдзіне XVIII стагоддзя Вялікай Бераставіцы было дадзена Магдэбургскае права, і на тым дакуменце захаваўся адбітак пячаткі з вавёркай на авальным шчыце пад залатой каронай. Гэта пячатка і была пакладзена ў аснову сучаснага герба, які быў зацверджаны Указам Прэзідэнта да 500-годдзя гарадскога пасёлка.

Тэма вавёркі атрымала далейшае развіццё ў стварэнні манумента «Дрэва жыцця» вядомага гродзенскага скульптара Уладзіміра Церабуна. На бронзавым дрэве, вышыня якога большая за чатыры метры, уладкавалася вавёрка з каронай. Каб прывабіць турыстаў, у Вялікай Бераставіцы адкрылі яшчэ і адпаведны музей.

— Вавёрка — гэта сімвал багацця, дабрабыту, — расказвае **дырэктар музея Яўген ВОЛКАЎ.** — На тэрыторыі ВКЛ яна ўяўлялася таксама як адзіная дачка ў сям'і альбо нявеста на выданні. Многія гарады маюць на сваіх гербах выяву гэтага звярка — у Швецыі, Латвіі, Украіне і Германіі. Але большасць прадстаўлена ў Расіі. Магчыма, гэта звязана са здабычай пушніны. У Беларусі вавёрка на гербах двух гарадскіх пасёлкаў — Вялікай Бераставіцы і Акцябрскім, што на Гомельшчыне.

У музеі сабраны рэчы, звязаныя з сямействам вавёркавых. Гэта посуд, адзенне, паштовыя маркі, кнігі, цукеркі, манеты, нават першыя беларускія грошы... Ёсць і чучалы вавёрак, якія прывезены з майстэрні заказніка ў Брэсцкай вобласці. Яны размешчаны ў імправізаваным прыродным асяроддзі, разам з рознымі драпежнікамі, якія нясуць пагрозу гэтым звяркам.

Яўген Волкаў расказаў, што ў свеце налічваецца 280 відаў вавёрак. На інтэрактыўнай карце можна даведацца аб арэале іх распаўсюджання. Асобная экспазіцыя датычыцца прадстаўнікоў вавёркавых у Беларусі. З інфармацыі экскурсаводаў можна даведацца аб асаблівасцях гэтага звярка. Аказваецца, што адзін з відаў — суслік — знаходзіцца пад пагрозай знікнення. А нядаўна на тэрыторыі краіны зарэгістравана вавёрка-палятуга, яе яшчэ называюць лятучай. Гэта даволі рэдкі звярок, занесены ў Чырвоную кнігу. Ёсць звесткі, што ў Англіі ў XIX стагоддзі было модна трымаць дома вавёрак, быццам яны нават разумнейшыя за катоў...

У тэму

У Гродзенскай вобласці налічваецца каля 11 тысяч вавёрак. Гэта на 200 экзэмпляраў больш, чым пазалетась. Улікам звяркоў займаецца абласное лесагаспадарчае аб'яднанне. Як паведаміў **галоўны паляўнічы гаспадаркі Яўген АШАЕЎ**, вавёркі ўваходзяць у пералік пушных звяркоў, на якіх дазволена паляванне. Сезон пачынаецца з першай суботы лістапада і завяршаецца ў апошнюю нядзелю студзеня. Кошт адной пуцёўкі складае каля дзесяці рублёў. Праўда, сярод паляўнічых гэты від пушных звяркоў не вельмі папулярны, аб чым сведчыць іх шырокая распаўсюджанасць у прыродзе і стабільная колькасць.

Самым цікавым экспанатам можна лічыць жыхарку музея — чылійскую вавёрку дэгу па мянушцы Юзя. Яна жыве тут некалькі гадоў. Напачатку была спроба змясціць у музейны вальер звычайную насельніцу нашых беларускіх лясоў. Але, на жаль, яна не прыжылася. Работніца музея лічыць, што гэта сталася ад рэзкай змены тэмпературы, калі ўключылі ацяпленне. А вось чылійская вавёрка аказалася больш прыстасаванай да такіх умоў. Яе набылі ў Гродзенскім заапарку, і вось ужо некалькі гадоў яна з'яўляецца галоўным экспанатам.

— Гэта асоба зусім непераборлівая ў ежы, — адзначае Яўген Волкаў. — Харчуецца гарбузовымі семкамі, сушаным тапінамбурам, садавіной і агароднінай, купляем і спецыяльны корм.

Каб атрымаць патомства, у вальер да Юзі падсялілі вавёрку-самца, але яна не прыняла яго і ледзь не скалечыла. Прыйшлося яго вызваляць ад такога суседства. Між тым гарэзлівая Юзя вельмі спакойна рэагуе на наведвальнікаў музея, не хаваецца ад іх і заўсёды гатова прыняць пачастунак ад музейных работнікаў. Паколькі Юзя прывыкла жыць адна, звярка вырашылі перадаць у добрыя рукі, а для музея набыць парачку маладых чылійскіх вавёрак.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

НА ЧЫМ ВЕТКА ТРЫМАЕЦЦА

АСАБІСТЫ ПАДЫХОД ДА ЗАХАВАННЯ СПАДЧЫНЫ

Чым вядомая Ветка? Унікальнымі калекцыямі стараабрадніцкіх і беларускіх народных ікон, старадрукаваных і рукапісных кніг, дзівосных ручнікоў і традыцыйных строяў. Работы мясцовых «золатакавалёў», вышывальшчыц, рэзчыкаў па дрэве — рукатворны цуд. Аднак галоўны скарб музея не рэдкія экспанаты, а тыя людзі, якія тут працуюць.

З самага пачатку музей трымаецца на ідэі асабістага падыходу да захавання спадчыны. Гэта запавет яго заснавальніка — Фёдара Рыгоравіча Шклярава. Карэнны веткаўчанін са стараабрадцаў быў зачараваны культурай роднага краю. У 60-х гадах ён пачаў збіраць прадметы побыту, іконы, кнігі, саматканыя рэчы і іншыя «цікавінкі», якія ў той час можна было знайсці ў кожным доме на Веткаўшчыне. Мясцовы люд дбайна захоўваў спадчыну ў часы рэвалюцый і войнаў. Шкляраў разумеў, што такую спадчыну ад продкаў ні ў якім разе нельга страціць. Музей стаў другім домам Фёдара Рыгоравіча: ён уласнымі рукамі стварыў знакамітыя разныя вароты і дзверы для будынка, а ў аснову фондаў лягла яго ўласная калекцыя рарытэтаў.

Паслядоўнікі Шклярава — такія ж апантаныя людзі. Што цікава, у музеі зусім няма экскурсаводаў у класічным разуменні. Толькі навуковыя супрацоўнікі, кожны з якіх мае сваю адмысловую тэму. Генадзь Лапацін — адзін з найлепшых фалькларыстаў Беларусі, знаўца традыцый і абрадаў. Ларыса Раманава таксама вывучае фальклор, але перш за ўсё курыруе педагагічны кірунак музея. Галоўны захавальнік фондаў Святлана Лявонцьева літаральна жыве ў старадрукаваных і рукапісных кнігах. Дырэктар музея Галіна Нячаева, як ніхто іншы, раскажа пра веткаўскі іканапіс. Яна ж раскрывае загадкі касмалагічнага боку жыцця чалавека. Натуральна, калі прайсціся па музеі з рознымі супрацоўнікамі, пачуеш абсалютна новую інфармацыю: што каму бліжэй, той пра тое і гаварыць будзе.

— Любы прадмет і з'ява — гэта «тэкст» духоўнай традыцыі. Мы не разглядаем ікону як ікону, ручнік як ручнік, гаршчок як гаршчок. Гэта, перш за ўсё, носьбіты інфармацыі. У адным кантэксце гэтыя сімвалы чытаюцца так, у другім — гэтак, — тлумачыць Галіна Нячаева.

У Веткаўскім музеі якраз працуюць людзі, якія ўмеюць гэтыя «тэксты» чытаць. Кожная рысачка на гаршку, шывок на ручніку, слова ў песні мае пад сабой сакральную аснову. Гэта код, перададзены продкамі. У час татальнай глабалізацыі, сцірання культурных адрозненняў (як натуральнага, так і наўмыснага) надзвычай важна часцей пазіраць назад, каб не забыцца пра тое, хто мы ёсць і адкуль выйшлі.

Формула поспеху гэтага музея простая: шануй сваё, тым і будзеш цікавы. Тут гісторыя чалавецтва раскрываецца праз прызму аднаго асобна ўзятага рэгіёна — ад першых стаянак амаль да сучаснасці. З 12 тысяч(!) экспанатаў выпадковых няма, усё выключна мясцовае — Веткаўскае і памежных раёнаў. А супрацоўнікі з такой цеплынёй расказваюць пра родны край, што, адкуль бы ні прыехалі турысты, яны пачынаюць яго любіць.

НЕ ЎМЕЕШ — НАВУЧАЦЬ

Веткаўскі музей, знаходзячыся ў гарадку з насельніцтвам менш за 10 тысяч чалавек, мае філіял у абласным цэнтры — Гомелі. Гэта ўнікальная з'ява для Беларусі. Невялікі аднапавярховы будынак знаходзіцца на тэрыторыі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Звонку нічога не выдае ў ім «чужака», ён цудоўна ўпісваецца ў агульную канцэпцыю дваранскай раскошы. Затое ўнутры пачуваеш сябе быццам у вясковай хаце. Ручнікі, іконы, некалькі ткацкіх станкоў.

— Паспрабуеце? — з ходу пытаецца загадчык філіяла Пятро Цалка, жэстам запрашаючы прысесці за кросны.

— Дык я ж не ўмею!

— Нічога, мы навучым. У нас адзін станок спецыяльна для наведвальнікаў запраўлены. З кожнага, хто прыходзіць, па нітцы — глядзіш і палатно атрымаецца.

У памяшканні невялікай музейнай майстэрні на сцяне вісіць вялізнае пано з мноства асобных кавалкаў тканіны з вышытымі птушкамі. Усе яны розныя, таму што рабілі іх таксама наведвальнікі.

— Першапачаткова філіял задумваўся як цэнтр адраджэння рамёстваў. У нас працуе клуб «Параскева», дзе кожны ахвотны можа навучыцца ткаць, выкройваць і вышываць. Ужо тры чалавекі, натхніўшыся музейнымі заняткамі, паставілі ў кватэрах кросны.

Пятро такі ж апантаны сваёй тэмай, як і яго калегі з Веткі. Падчас вучобы ва ўніверсітэце проста ў інтэрнаце абсталяваў майстэрню і пачаў спасцігаць таямніцы «бабулінага рамяства». Так хацеў навучыцца ткаць! Хлопец жартаўліва называе сябе «маркетынгавым ходам» у рабоце музея:

— Бывае, спецыяльна прыходзяць людзі, каб паглядзець на хлопца за кроснамі. Дзіўна гэта для вясковай культуры, дзе ткалі толькі дзяўчаты. З іншага боку, калі паглыбіцца ў гісторыю ткацтва, то не ўсё так адназначна. Зірнём на старажытныя гравюры ці грэцкія амфары і ўбачым на іх выключна мужчын, якія ткуць. А хто стаяў ля вытокаў знакамітых слуцкіх паясоў? Ян Маджарскі з сынам Лявонам. Хоць у маім выпадку інакш было б немагчыма. Пакуль сам ткаць не навучышся, не спазнаеш рамяство рукамі, то і расказваць іншым пра яго не зможаш. У музей часта прыходзяць дзеці. Ты ж не будзеш з імі навуковымі тэрмінамі размаўляць. Галева, рэмізка, батан, вал... Бабулі-ткачыхі з вёскі так не кажуць. У іх тлумачэнне простае: «Ета козлы, на которых стояць кросны. А ета чолночок. Чаму чолночок? Ну таму што ён плавае...» Вось гэта зразумела і ўсе запомняць.

ПОЎНАЕ ПАГРУЖЭННЕ

Музей у Ветцы — гэта перш за ўсё шыкоўная пастаянная экспазіцыя, якая ў поўнай меры адлюстроўвае хараство і ўнікальнасць культуры рэгіёна. У філіяле ж робяць акцэнт на зменныя выстаўкі. Прыадкрываюць толькі маленькую часцінку таго, што маецца на Веткаўшчыне. Абуджаюць апетыт. Пасля абавязкова хочацца глыбей акунуцца ў свет таямнічых ікон, кніг і ручнікоў. За гэтым народ і едзе ў райцэнтр.

На мінулым тыдні ў філіяле адбылося адкрыццё выстаўкі аднаго экспаната — рукапісу «Чырвонае Евангелле» (XVI стагоддзе).

— Дагэтуль ён выстаўляўся ў закрытым выглядзе. Народ пытаўся: «А што ўнутры?» Паказаць кнігу паўнавартасна даволі складана, перад музейшчыкамі пастаянна стаіць выбар — вокладка альбо змест, — кажа Пятро. — Мы прапаноўваем унікальную магчымасць апынуцца «ўнутры» старажытнага рукапісу і разгледзець яго з усіх бакоў. Цікавы ход у афармленні выстаўкі прыдумаў наш будучы супрацоўнік, студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аляксандр Нікіцін. Ён па-маладому смела пафарбаваў столь у чырвоны колер і ўпрыгожыў выявамі фрагментаў з вокладкі. Яна быццам накрывае наведвальнікаў.

Візітная картка філіяла Веткаўскага музея ў асенне-зімовы перыяд — этнавечарыны, якія ладзяцца штомесяц. Народ на іх збіраецца розны: ад міліцыянераў і настаўнікаў да пенсіянераў і завадчан. Кожная сустрэча складаецца з дзвюх частак — адукацыйнай і спеўна-танцавальнай.

— Спачатку расказваем пра мясцовыя асаблівасці пэўнага абраду ці свята, якому прысвечана вечарына. Што, як і для чаго рабілі нашыя продкі сто-дзвесце гадоў таму. А пасля пачынаецца ўласна вечарына, дзе кожны — удзельнік, — дзеліцца Пятро. — Мы танчым не проста беларускія народныя танцы, але канкрэтна «гомельшчыну». Што запісалі ў экспедыцыях, тое і скачам. Музыкаў запрашаем з розных гомельскіх вёсак, гучыць толькі жывая музыка. І, вядома, аніводнае беларускае свята не абыходзіцца без багатага стала. Удзельнікі звычайна прыносяць смакату з сабою. Адшукваюць старадаўнія рэцэпты сваіх бабуль.

Напрыклад, не так даўно ў філіяле прайшла «Жаніцьба коміна», якую калісь адзначалі па заканчэнні работ на полі. Хутка пачнецца Піліпаўскі пост і будуць «кудзельныя сустрэчы» з пераціраннем лёну і прадзеннем. Ладзяць тут і рэканструкцыю вясковага вяселля, гукаюць вясну і рыхтуюцца да пахавання «стралы» (старажытны абрад на Веткаўшчыне, які праводзілі напрыканцы вясны, каб выклікаць дождж). Неверагодна папулярны ў нас цыкл Калядных вечарын. Прыходзяць на іх цэлымі сем'ямі. Дзецям — батлейка і асобная прастора з цацкамі, дарослым — варажба, танцы, ігрышчы. Цікава, што для тых, хто прыходзіць на вечарыны ў нацыянальным строі, уваход бясплатны.

— Першым часам некаторыя надзявалі на сустрэчы вышымайкі, — успамінае Пятро. — Але, нагледзеўшыся на музейных супрацоўнікаў у рэканструяваных па-старому кашулях, таксама пераходзяць на сапраўднае традыцыйнае адзенне. Шыюць яго на аснове аўтэнтычных строяў з калекцыі музея.

Сёлета супрацоўнікі філіяла паспрабавалі новы фармат работы з наведвальнікамі — зладзілі летнік ў вёсцы Неглюбка. Групу з дзесяці чалавек вучылі сакрэтам ткацтва і не толькі. Раніцамі спявалі, бралі майстар-класы ў мясцовых жанчын, слухалі лекцыі па сімволіцы арнаменту. Не абышлося і без этна-дыскатэкі пад гармонік пры святле керасінкі.

Вось так весела, шумна, без нудных расповедаў экскурсаводаў людзі, самі таго не заўважаючы, спазнаюць гісторыю Веткаўшчыны.

Ганна КУРАК.

Мінск — Ветка — Гомель — Мінск.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ В ОСТРОВЕ ЧИСТОТЫ! ТУР 11»

1. Сведения об организаторе.

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (Далее – Организатор).

УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8.

Почтовый адрес: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8 (5-й этаж).

2. Наименование Рекламной игры.

«**Счастливый случай в Острове чистоты! Тур 11**».

3. Территория проведения.

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины «Остров чистоты» zht.by, zhs.by, zhi.by.

4. Сроки проведения.

16.11.2018 – 29.12.2018 (включая период розыгрыша и вручения призов).

5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.

Председатель:

Смаль Арина Олеговна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

Члены комиссии:

1. Стасюк Евгений Владимирович, ООО «ЗападХимИнвест», ведущий специалист по рекламным коммуникациям.

2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», ведущий маркетолог.

3. Веренич Марина Михайловна, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по маркетингу.

4. Ширинова Ольга Францевна, ООО «Торговая компания Ромакс», начальник отдела ВЭД.

6. Перечень продукции, участвующей в Игре.

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж товаров, реализуемых в дискаунтерах «Остров чистоты» и интернет-магазинах «Остров чистоты» zht.by, zhs.by, zhi.by (за исключением табачных изделий и некоторых видов детского питания (Приложение 1)), с условием обязательной покупки как минимум одного из «Товара-счастливчика» торговых марок «Bella», «Черный жемчуг», «Wella Shockwaves», «Palmolive», «Blend-a-med», «Oral-B», «Sorti», «Rexona», «Dove», «i-Clean», «I-Fresh», «Romax», «Richard», «Curtis», «Майский», «Лисма», «Zawarko», указанных в Приложении 2.

7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 16.11.2018 по 30.11.2018:

1. Совершить покупку в любом магазине «Остров чистоты» или на сайте интернет-магазина zht.by, zhs.by, zhi.by на сумму не менее 10 (десять) белорусских рублей в одном чеке любых товаров (за исключением табачных изделий и некоторых видов детского питания (Приложение 1)), включая не менее 1 (одного) «Товара-счастливчика согласно перечню товаров (Приложение 2), применив на кассе торгового объекта «Остров чистоты» при расчете за покупку дисконтную карту.

Покупатели, осуществляющие расчет за товар на кассе торгового объекта «Остров чистоты» с использованием карт рассрочек («Халва», «Карта покупок» и др.), не могут быть участниками Рекламной игры, так как дисконтная карта не может быть применена при расчете картами рассрочек в соответствии с Положением о дисконтной карте «Остров чистоты».

2. Достоверно заполнить персональные данные и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на интернет-сайте ostrov-shop.by (либо проверить корректность ранее заполненных данных), а именно:

– фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);

– адрес пребывания, проживания в Республике Беларусь: область (желательно), район (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);

– адрес электронной почты (желательно);

– абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);

– оператор сотовой связи velcom, МТС, life:).

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях были подтверждены ранее, повторное подтверждение не требуется.

Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.) автоматически по порядку.

Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в пп. 1 и пп. 2 п. 7 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного, Игровой код на дату и время регистрации на интернет-сайте.

Каждому покупателю, который совершил повторные действия, указанные в пп.1 и пп. 2 п. 7 настоящих Правил (и который прошел прежде регистрацию на интернет-сайте), присваивается порядковый Игровой код по дате и времени покупки.

Присвоенные Игровые коды отображаются в диалоговом окне личного кабинета интернет-сайта в течение 3 (трех) суток после присвоения.

Участник получает один Игровой код за каждые полные 10 (десять) белорусских рублей в чеке, который содержит не менее 1 (одного) «Товара-счастливчика» (например, за 50 (пятьдесят) белорусских рублей в чеке, который содержит не менее 1 (одного) «Товара-счастливчика» участник получает пять Игровых кодов).

Если в чеке присутствуют табачные изделия и некоторые виды детского питания (Приложение 1), то их стоимость при присвоении Игровых кодов исключается.

Каждый участник может принимать участие в рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения установленных условий Рекламной игры.

8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 57 474,17 (Пятьдесят семь тысяч четыреста семьдесят четыре) рубля семнадцать копеек и включает следующие призы:

№ п/п	Наименование	Кол-во, шт.	Цена за ед., бел. руб. с НДС	Всего, бел. руб. с НДС
1	Автомобиль КИА RIO_FB, Z94C241BAJR078539, РФ	1	26900	26900
	и денежное вознаграждение	1	4001,31	4001,31
